ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ ВСЯГО СВЕТУ, САЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 175 (3283) Субота, 3-га жніўня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

РАДЫЁ У ГАДЗ. НОЧЫ:

ВЕНА, 31. «Ротэ Фанэ» паведамляе аб рабочых сустрэчах, наладжаных у нядзелю на межах Аўстрыі, Юга-Славіі і Чэха-Славакіі. З асаблівым посьпехам прашоў мітынг, арганізаваны ля чэха-славацкай граніцы. На мітынгу выступіў чэха-славацкі салдат, які заклікаў да барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і да абароны Савецкага Саюзу.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Трактары для Гомельшчыны

ГОМЕЛЬ, 2. Гомельская акруга атрымала 62 трактары, з якіх будзе арганізавана 7 трактарных калён. Побач з гэтым, за сродкі камсамольцаў арганізуецца камсамольская калёна.

Некаторыя вынікі

Зараз можна гаварыць толькі аб некаторых агульных папярэдніх выніках праведзенага Міжнароднага Чырвонага Дня.

Перш за ўсё—каб водгуку мас на заклік партыі, на заклік Камінтэрну. Шматлюдныя мітынгі 1-га жніўня ў гарадох, мястэчках і вёсках па ўсяму Саюзу і ў прыватнасьці па БССР паказваюць, што гэты заклік пачулі самыя шырокія масы працоўных. На вуліцу ў гэты дзень выйшла вялікая колькасьць рабочых і сялян. І гэта — ня гледзячы на летні час, ня гледзячы на адпускі, пачатак палявых работ і інш. Лёзунгі на плякатах дэманстрантаў, выступленьні радавых рабочых, сялян, работніц і сялянак, паказваюць на поўную асьвядомленасьць мас аб мэтах і задачах Дня і на поўную іх адданасьць справе міжнароднай рабочае клясы. Самыя шырокія масы працоўных паказалі, што яны добра разьбіраюцца ў сусьветных падзеях, якія адбываюцца, добра ўлічваюць міжнароднае становішча і гатовы даць магутны адпор усякаму нападу на сваю сацыялістычную бацькаўшчыну.

Аднак, умацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны залежыць ня толькі ад магутнасьці нашай Чырвонай армії, ад колькасьці штыхоў і гармат, якія ёсьць у распараджэньні пралетарскае дзяржавы. Яно залежыць у вялікай ступені таксама ад магутнасьці нашае народнае гаспадаркі і перш за ўсё—ад магутнасьці індустрыі.

Праведзены Міжнародны Чырвоны Дзень паказаў, што рабочыя і сяляне разумеюць і ўлічваюць гэтую апошнюю вкапічнасьць. На плякатах і ў выступленьнях часьцей за ўсё гаварылася іменна ад гэтым: аб стопроцантнай падпісцы на новую пазыку індустрыялізацыі, аб барацьбе за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, аб «першым снопе» новага ўраджаю на справу індустрыялізацыі, аб калектывізацыі вёскі і г. д.

Міжнародны Чырвоны Дзень у нас у БССР, як і ва ўсім Саюзе, паказаў, што масы, як і раней, і яшчэ больш аддана і сьвядома ідуць пад лёзунгамі нашай партыі, што давер'е да партыі сярод рабочых і сялян паранейшаму бязьмежнае.

Мы яшчэ ня ведаем, як прайшоў дзень 1-га жніўня за межамі, у капіталістычных краінах. Але тая ліхаманка, якая ахапіла заможныя клясы ўсіх краін ПЕРАД 1-м жніўня, лепш за ўсё гаворыць нам аб «настроях» міжнароднага пралетарыяту. Гэтыя «настроі», відавочна, больш чым проста, «няспляючыя» для капіталістых і іх лёкаеў, сацыял-дэмакратаў. Буржуазія пасьпешна ўмацоўвае паліцэйскія кадры, сканцэнтроўвае ў гарадох вайсковыя часьці, робіць папярэднія арышты сярод камуністых, граміць рэдакцыі камуністычных газэт і нават (у Парыжы) ўжывае новыя ўдасканаленыя спосабы барацьбы з рабочымі—паліцэйскія азрапляны.

Усе гэтыя мерапрыемствы буржуазіі напярэдадні 1-га жніўня гавораць аб тым, што сусьветны пралетарыят, ня гледзячы на ўсе перашкоды, пачуў заклік Камінтэрну супроць вайны, што гэты заклік упаў на ўдзячную глебу, што ўсякія згодніцкія ілюзіі ўсё больш і больш знішчаюцца ў радох рабочае клясы, што сусьветны рабочы рух усё больш і больш рэвалюцыянізуецца.

Магчыма, аднак, што тэрорам і папярэднімі рэпрэсіямі буржуазіі ўдалося ў радзе краін не дапусьціць правядзеньня Чырвонага Дня або заліць яго пралетарскай крывёю. Але, загнаны ў глыбіню рух пратэсту супроць падрыхтоўкі новай вайны, накіраваный сваім гастрыем супроць СССР, пры такім становішчы мае ўсе шансы стаць яшчэ больш папулярным у вачох шырокіх мас усяго сьвету. Такі ўжо лёс аджываючых кляс: усякі іх посьпех ёсьць посьпех адносны і часовы, які неадкладна цягне за сабою ўзмоцненае насьпяваньне новых канфліктаў.

Як бы там ня было, ужо зараз відаць, наколькі правільна і своячасова была пастанова VI Кангрэсу Камінтэрну аб Міжнародным Чырвоным Дні.

Сусьветны рабочы рух пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу зрабіў яшчэ адзін буйны крок наперад па шляху да канчатковай перамогі.

Правакацыйная прапанова мукдэнскага ўраду

Мукдэн зрывае магчымасьць урэгуляваньня канфлікту

МАСКВА, 2. Намесьнік Народнага Камісара па замежных справах тав. Карахан атрымаў ад кіраўніка мукдэнскага ўраду Чжан Сюэ-ляна ліст, перададны па тэлеграфу.

Ніжэй падаецца тэкст гэтага лісту і адказ на яго.

Ліст генэрала Чжан Сюэ-ляна да нам. наркома па замежных справах т. Карахана

ШАНОЎНЫ ПАН КАРАХАН!

Пасьля абмену думкамі паміж генэральным консулам у Харбіне Мельнікавым і камісарам па замежных справах панам Цая апошні паехаў у Мукдэн, дзе врабіў даклад аб К.-Усх. чыгунцы.

Каб вырашыць існуючыя непаразуменьні прапануецца тры наступных прапановы: 1. Кітайскі ўрад і ўрад СССР назначаюць кожны свайго прадстаўніка для скліканьня канфэрэнцыі па пытаньнях аб К.-Усх. чыг. 2. Існуючае становішча на К.-Усх. чыгунцы прызнаецца нармальным і не падлягаючым урэгуляваньню на канфэрэнцыі на падставе Пекінскае і Мукдэнскае згоды. 3. Арыштаваныя грамадзяне СССР афіцыяльным парадкам вызваляюцца і высяляюцца ў СССР. Арыштаваныя ў СССР кітайцы таксама павінны быць вызвалены.

Наконт гэтых трох пунктаў прашу даць тэлефонны адказ.

З пашанаю Чжан Сюэ-лян.

29-га ліпеня.

Адказ намесьніка наркома па замежных справах т. Карахана

ШАНОЎНЫ ПАН ЧЖАН СЮЭ-ЛЯН!

22-га ліпеня 1929 году камісар па замежных справах пан Цая па яго просьбе быў прыняты консулам СССР у Харбіне Мельнікавым і заявіў апошняму, што толькі што прыбыў з Мукдэну і мае даручэньне ад мукдэнскага ўраду врабіць у мэтах урэгуляваньня савецка-кітайскага канфлікту на К.-Усх. чыг. наступныя прапановы:

1. Арыштаваныя савецкія рабочыя і служачыя вызваляюцца.

2. Урад СССР назначае кіраўніка К.-Усх. чыг. і яго памочніка.

3. Склікаецца канфэрэнцыя ўпоўнаважаных абодвых урадаў, якая ў кароткі тэрмін урэгулюе канфлікт аб К.-Усх. чыг.

4. Савецкі ўрад можа заявіць аб тым, што існуючы пасьля канфлікту парадак ім ня прызнаецца і ні да чаго ў маючых адбыцца перагаворах не абавязвае і

5. Калі савецкі ўрад згадзіцца в гэтымі прапановамі, то пан Чжан Сюэ-лян папросіць згоды нанкінскага ўраду на гэтыя прапановы.

Консул Мельнікаў адмовіўся абгаворваць гэтыя прапановы пана Цая, указаўшы, што ён ня мае на гэта ніякіх паўнамоцтваў і што пункт погляду савецкага ўраду выяўлен у яго ноце ад 13-га ліпеня.

Аднак, з прычыны просьбы пана Цай давесьці аб гэтай прапанове да ведама саюзнага ўраду, Мельнікаў перадаў прапанову Мукдэнскага ўраду ў НКЗС. Саюзны ўрад, кіруючыся сваёй міралюбівай палітыкай і не жадаючы пакінуць нескарыстанай і гэтую магчымасьць урэгуляваньня канфлікту шляхам згоды пайшоў на ўступкі і даручыў Мельнікаву ў Харбіне даць пану Цаю для перадачы Вам, як главе Мукдэнскага ўраду, наступны адказ:

А) Пасьля меўшых месца захватных дзеяньняў кітайскіх улад на К.-Усх. чыгунцы Саюзны ўрад ня можа адмесьціся з давер'ем да прапаноў, што паступілі ад мукдэнскага ўраду праз камісара па замежных справах пана Цая.

Б) У выпадку аднак, калі нанкінскі або мукдэнскі ўрад афіцыяльна робіць ураду СССР ад імя Чжан Сюэ-ляна прапановы, а іменна: 1) Вызваленьне арыштаваных савецкіх рабочых і служачых. 2) Назначэньне ўрадам СССР кіраўніка К.-Усх. чыг. і яго памочніка. 3) Скліканьне канфэрэнцыі для ўрэгуляваньня ў самы кароткі тэрмін канфлікту на К.-Усх. чыг., і калі, акрамя таго, пункт 4-ты прапановы мукдэнскага ўраду будзе выменены наступным чынам: абодвы бакі прызнаюць, што становішча, якое стварылася на К.-Усх. чыг. пасьля канфлікту падлягае зьмене ў адпаведнасьці з пекінскай і мукдэнскай згодамі 1924 г., то савецкі ўрад прыхільна адносіцца да гэтых прапаноў.

Гэты адказ быў паведамлены Мельнікавым пану Цая ў Харбіне 25-га ліпеня а 4 гадз. дня. 30-га ліпеня г. г. пан Цая прыбыў на ст. Манчжурыя і паведаміў грамадзяніна Мельнікава, які знаходзіўся ўжо на тэрыторыі Савецкага Саюзу, аб сваім жаданьні спаткацца з ім для перадачы прапановы мукдэнскага ўраду. 1-га жніўня пан Цай перадаў гр. Мельнікаву ваш ліст ад 29-га ліпеня г. г., вымест якога мне перададны па тэлеграфу.

Я прымушаны канстатаваць, што прапанова, паданая ў вашым лісьце ад 29-га ліпеня істотна адрозьніваецца ад тае прапановы, якую па вашым-жа даручэньні пан Цай врабіў грамадзяніну Мельнікаву, а іменна ў наступным: **папершае, у вашым лісьце зусім выпушчана прапанова, зробленая ад вашага імя панам Цая 22-га ліпеня аб неадкладным назначэньні ўрадам СССР кіраўніка К.-Усх. чыг. і яго памочніка.**

Падругое, замест запрапанаванай саюзным урадам формулы, што становішча, якое стварылася на К.-Усх. чыг. пасьля канфлікту падлягае зьмене ў адпаведнасьці з пекінскай і мукдэнскай згодай, у вашым лісьце ёсьць прапанова аб легалізацыі створанага шляхам гвалтоўнага захвату чыгункі цяперашняга становішча на К.-Усх. чыг., якое зьяўляецца відавочным парушэньнем пекінскае і мукдэнскае згоды.

Такім чынам і павінен канстатаваць, што наперакор сваёй прапанове ад 22-га ліпеня мукдэнскі ўрад сваёй новай прапановаю зрывае магчымасьць урэгуляваньня канфлікту шляхам згоды, якая магчыма толькі шляхам прыняцьця прапановы Саюзнага ўраду ад 25-га ліпеня г. г. Гэтым ствараецца становішча, якое можа мець новыя сур'ёзныя ўскладненьні, уся адказнасьць за якія цалкам і поўнасьцю кладзецца на мукдэнскі і нанкінскі ўрад.

Прымеце і іншае КАРАХАН.

1-га жніўня 1929 г.

Правакацыя працягваецца

Савецкі ўрад праявіў максымум міралюб'я і вытрыманасьці ў адказе на захват К.-Усх. чыгункі, на сыстэматычныя правакацыйныя выклікі нанкінскіх і мукдэнскіх мілітарыстых, на гвалты і бясчынствы над савецкімі грамадзянамі. На ўсе гэтыя ўчынкі савецкі ўрад рэагаваў толькі закрыцьцём граніцы і спыненьнем транзіту на К.-Усх. чыг.

Выходзячы з інтарэсаў працоўных мас Савецкага Саюзу і Кітая і жаданьня як мага хутчэй ліквідаваць канфлікт, савецкі ўрад у адказ на прапанову Цая выказаў гатоўнасьць весьці перагаворы. Аднак, савецкі ўрад ні ў якім выпадку ня мог згадзіцца хаця-б на часовую санкцыю існуючага становішча на К.-Усх. чыг., створанага бандыцкімі дзеяньнямі кітайскіх генэралаў.

Цяпер, пасьля значнай цяганіны, савецкі ўрад мае у сваім распараджэньні адказ мукдэнскага ўраду, які па свайму нагламу і абураючаму тону нельга назваць інакш, як новым выпрабаваньнем савецкага міралюб'я. У гэтым адказе **мукдэнскі ўрад ня робіць ніводнага кроку наперад параўнальна з апошняй кітайскай нотай,** якая выклікала разрыў дыплёматычных зносін. Такі адказ прадыктаваны інтарэсамі імпэрыялістычных грабежнікаў кітайскага народу, якія падрыхтоўваюць вайну супроць СССР. Ён зьяўляецца лёгічным працягам тэйжа правакацыйнай палітыкі, якая знайшла сабе выяўленьне ў гвалтоўным захвацe К.-Усх. чыг.

Правакацыя гаміндаўскіх генэралаў працягваецца. Яна, натхнёная імпэрыялізмам, ставіць сваёй задачай ва што-б там ні стала працягнуць і абвострыць канфлікт. Працоўныя масы Савецкага Саюзу здолеюць даць належную адпэнку гэтай правакацыі. Цьвёрды і рашучы адказ савецкага ўраду знойдзе з іх боку аднадушнае спачуваньне і падтрыманьне. («Правда»).

Па сьлядох цьвёрдалобых

Перагаворы тав. Даўгалеўскага з Гендэрсонам у Лёндане і ўмовы, высунутыя ангельскім міністрам замежных спраў у якасьці прадпасылкі аднаўленьня зносін з СССР з бясспрэчнасьцю сьведчаць, **што ўрад рабочай партыі ў гэтым пытаньні сапраўды не зрабіў ніводнага кроку наперад параўнальна з пазыцыяй Бальдвіна, і адказ Гендэрсона на прапанову тав. Даўгалеўскага неадкладна абмяняцца пасламі, ні на ёту не адрозьніваецца ад аналёгічных і неаднаразовых заяў Чэмбэрлена. Урад рабочай партыі думае, што трэба спачатку «прыступіць да перагавораў пасутнасьці ўсіх спрэчных пытаньняў паміж Вялікабрытаніяй і СССР», а толькі потым могуць быць адноўлены ды пляматычныя зносіны паміж абедзьвюма краінамі.** Дакладна нічога іншага не дамагаўся і Чэмбэрлен.

Далей «Правда» канстатуе, што выгады ўрэгуляваньня англа-савецкіх адносін дастануцца перш за ўсё Англіі. Англія ня менш, калі ня больш зацікаўлена ў савецкім рынку, чым СССР у ангельскім.

Аналізуючы высунутыя ўрадам Макдональда патрабаваньні, «Правда» паказвае, што «узьнімаючы пытаньне аб прэтэнзіях ангельскіх капіталістых да Савецкага Саюзу, урад Макдональда забывае зусім аб тых прэтэнзіях, якія можа прад'явіць яму урад Савецкага Саюзу.

Таксама наконт умяшаньня ва ўнутраныя справы савецкі ўрад мог бы прад'явіць Англіі значна больш цяжкі і грунтоўны довад, чым «ліст Зіноўева».

Вывад паўстае сам сабою. **Урад рабочай партыі мае намер працягваць антысавецкую палітыку кансэрватараў, тую самую палітыку, супроць якой ён выступаў на выбарах, зарабіўшы на гэтай справе некалькі мільёнаў рабочых галасоў. Ашуканыя рабочыя здолеюць зрабіць вывады з гэтай палітыкі.** Мы ня думаем, каб ангельская буржуазія многа на ёй зарабіла. Цьвёрдалобыя аўтары фальшывых дакумантаў ужо зламалі на іх сваю галаву. Наўрад-ці больш шчасьлівы лёс чакае «рабочы» урад, які ідзе па іх сьлядох.

(З арт. «Правды»).

НАСТУПЛЕНЬНЕ КАПІТАЛУ Ў АНГЛІІ

Як вядома, з 29 ліпеня ў Манчэстэры, буйнейшым цэнтры ангельскай тэкстыльнай прамысловасьці пачаўся лёкаут (разьлік) 500.000 тэкстыльшчыкаў.

За апошнае дзесяцігодзьдзе, капіталістычная Англія ня ведала лёкаута такіх вялікіх разьмераў. Выклік кінуты саюзам манчэстэрскіх прадпрыемцаў у адказ на адмаўленьне рабочых згадзіцца на 12 з палов. процантнае зьніжэньне заработнай платы.

Лёкаут гэты—гэта пачатак упартых клясавых баёў у Англіі пры ўрадзе «рабочай» партыі, пачатак наступальных манэўраў ангельскай буржуазіі.

Пры ўрадзе цьвёрдалобых каралі манчэстэрскай прамысловасьці толькі пагражалі лёкаутам—ды і то толькі 200 тысячам тэкстыльшчыкаў. Калі ўладу мае «рабочая» партыя, гэта пагроза выконваецца.

Адкуль выходзіць гэта «драчливость» прадпрыемцаў, іх «татоўнасьць да бою», у момант, калі ўвесь апарат дзяржаўнай улады, здавалася-б, знаходзіцца ў руках макданальдаўцаў?

Адказ просты: **прадпрыемцы ўпэўнены, што згодніцкія прафсаюзы пры непасрэдным садзейнічаньні ўраду «рабочай» партыі ў апошнюю хвіліну прымусяць тэкстыльшчыкаў пайсьці на зьніжэньне заработнай платы,** між тым, як пры ўрадзе цьвёрдалобых правадыры згодніцтва, якія рабілі стаўку на ўлаўленьне рабочых галасоў на выбарах, бадай, адмовіліся-б падтрымліваць адкрыта патрабаваньні фабрыкантаў.

Разьлік правільны. Каралі ангельскай прамысловасьці добра ведаюць сваіх падручных са згодніцкага лягеру. Яны памятуюць, што амаль за цэлы год да стварэньня ўраду «рабочай партыі» Макданальды і Гендэрсоны заядла заклікалі ангельскіх рабочых згадзіцца на той «мір у прамысловасьці», які прапаноўвае вядомы прамыслоўца лёрд Мэльчэт, ён-жа Мэнд. Гэты «мір у прамысловасьці» азначаў нішто іншае, як добраахвотнае адмаўленьне рабочых ад ужываньня забастовачнай барацьбы.

У гэтых адносінах мы можам гаварыць аб поўнай аналёгічнасьці падзеі у Англіі і Нямеччыне. У мінулым годзе вялічэзныя клясавыя баі ў Нямеччыне, і асабліва ў Рурска-Вэстфальскім мэталюргічным раёне, пачаліся па пачыну арганізацый прадпрыемцаў ледзь не на другі дзень пасьля таго, як сацыял-здраднікі ўвайшлі ў склад ураду. Каралі цяжкай нямецкай прамысловасьці **перайшлі ў наступленьне па лініі падаўжэньня рабочага дня.** Яны ніколі ня сумняваліся ў тым, штосацыял-згоднікі ў патрэбную хвіліну ўмяшаюцца ў справу і **прымусяць рабочых згадзіцца на «трацэйскі» разгляд.** Так яно і здарылася.

Тое-ж самае наглядаецца зараз і ў Англіі. Адсюль сам сабою паўстае вывад, што ангельскаму капіталу, у прыватнасьці, цьвёрдалобай партыі, было выгадна, каб улада на некаторы час перайшла да макданальдаўцаў: **у гэтых умовах капітал сьмела і безпамылкова можа разьлічваць на палітыку «чего изволите» з боку правадыроў сацыял-згодніцтва.**

І сапраўды, першыя два месяцы кіраваньня «рабочай» партыі поўнасьцю апраўдалі разьлікі капіталістых-прадпрыемцаў.

Успомнім: пытаньне аб скасаваньні закону супроць прафсаюзаў, выданага цьвёрдалобымі пасьля ўсеагульнай забастоўкі 1926 г., павісла ў паветры. У адносінах да вугальнай прамысловасьці уплывовыя правадыры згодніцтву у поўнай сугучнасьці з галасамі прадпрыемцаў заяўляюць, што ня можа быць «кутаркі» аб звароце да 7-мі гадзіннага рабочага дня.

Хіба-ж гэта не довад поўнай і бязумоўнай угодлівасьці сацыял-здраднікаў перад уладаю капіталу?

Прадпрыемцы-капіталістыя, якія заахвочваюцца гэтымі прыкладамі, сьпяшаюцца на далейшыя «гэройскія ўчынкі». **Яны абвясьцілі лёкаут 500.000 тэкстыльшчыкаў, бо яны ўпэўнены, што ўслужлівы лёкаў зробіць сваю справу.**

РАБОТА ФРАНКФУРЦКАГА КАНГРЭСУ

31-га ліпеня з Франкфурту прыехаў т. Мельнічанскі, які браў удзел у антыімпэрыялістычным кангрэсе. Тав. Мельнічанскі ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС паведаміў аб кангрэсе наступнае:

Кангрэс адкрыўся вялікай дэманстрацыяй у карысьць СССР у зьвязку з падзеямі на К.-Ус. чыгунцы. На адкрыцьці кангрэсу прысутнічала звыш 3 тысяч чалавек. Дэлегатаў сабралося каля 300, пры чым досыць значна былі прадстаўлены калёніі. Некаторым дэлегатам (Эгіпту, Манголіі і інш.) не ўдалося папасьць на кангрэс, бо ім ня былі выданы візы.

Работа кангрэсу адбывалася пад знакам **пераТварэньня арганізацый, якія належаць да антыімпэрыялістычнай лігі, у сапраўды баявыя рэвалюцыйныя арганізацыі барацьбы з імпэрыялізмам.**

У прамове Мэкстона (старшыня лігі) не было ясна, якія яго адносіны да сучаснага ангельскага ўраду і рабочай партыі, якія праводзяць на справе імпэрыялістычную палітыку. Гэта акалічнасьць выклікала ва ўсіх дэлегатаў аднагодную крытыку. Усе выступаўшыя дамагаліся ад Мэкстона даць выразны адказ: ці сумяшчальна прабываньне ў лізе з маўклівым адабрэньнем палітыкі ўраду Макданальда. Выступаўшыя патрабавалі ад Мэкстона яснай ацэнкі палітыкі рабочай партыі і незалежнай работы партыі. Яны патрабавалі адкрыта сказаць, ці будзе ён змагацца супроць іх за адкліканьне ангельскіх войск з калёніі, за вызваленьне арыштаваных у Індыі і г. д.

Асабліва яскравыя былі выступленьні прадстаўнікоў калёніяльных і паўкалёніяльных краін, якія расказвалі кангрэсу аб тых нявольніцкіх умовах існаваньня, у якія рабочыя і сяляне іх краін пастаўлены імпэрыялістымі.

Буржуазны друк,—асабліва сацыял-дэмакратычны,—вёў кампанію супроць кангрэсу, скажаючы прамовы выступаўшых. Асабліва моцнае абурэньне кангрэсу выклікаў сацыял-дэмакратычны «Форвэрц», які ў процівагу пастановам кангрэсу аб удзеле ў дэманстрацыі 1-га жніўня заклікаў да барацьбы з гэтай дэманстрацыяй.

У заключным пасяджэньні кангрэсу ўсе рэзалюцыі былі прыняты аднагалосна.

Кангрэс закончыўся выбарамі рады і выканкому антыімпэрыялістычнай лігі.

На першым пасяджэньні выканкому старшынёю лігі абраны Дэнгдзі—індускі рэвалюцыянэр, які зараз сядзіць у турме па міруцкаму працэсу.

МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ У МАСКВЕ

Вялізарныя дэманстрацыі ва ўсіх раёнах гораду

МАСКВА, 1-га жніўня ў Маскве адбыўся рад вялізарных дэманстрацый ва ўсіх раёнах гораду. У Бауманскім раёне дэманстрантаў вітаў тав. Лазоўскі. Воклiч Лазоўскага: «няхай Макданальд працягвае палітыку Бальдвіна, мы-ж будзем працягваць палітыку Леніна»—выклікаў буру апладысмэнтаў і крыкі «правільна». Сярод баўманцаў ішлі нямецкія піянэры са сьпевамі, забароненымі ў іх на бацькаўшчыне.

У пралетарскім раёне на мітынгу прысутнічала звыш 10 тысяч чалавек. У Хамоўніцкім раёне ў часе масовак у паветры ляталі самалёты, якія кідалі лятучкі.

Асабліва вялікай была дэманстрацыя ў Замаскварэччы. Агульную ўвагу выклікаў атрад бяногіх інвалідаў, былых удзельнікаў імпэрыялістычнай вайны. У парку Культуры і Адпачынку адбыўся вялізны мітынг, на якім працоўных Масквы віталі т. т. Калінін, Баўман і Максім Горкі. Усім выступаўшым рабочыя наладзілі бурную авацыю. Удзельнікі першамайскіх баёў у Берліне, чырвоны франтавік, выступаючы на мітынгу, заявіў:

«Які-б жорсткі тэрор ня ўжывала супроць нас буржуазія, у патрэбную хвіліну нямецкія рабочыя... выступяць на абарону сваёй пралетарскай бацькаўшчыны — СССР». Заява гэта была спаткана крыкамі «ура».

У Красна-Прэсьненскім раёне выступалі т. т. Рудзутак і Яраслаўскі. Тав. Рудзутак заклікаў працоўных да пільнасьці і ўпартае творчае працы для абароны сацыялістычнае бацькаўшчыны. З вялікім энтузіязмам была спаткана заява прадстаўніка луганскіх рабочых аб тым, што ў верасьні рабочыя Луганску прышлюць Маскве ў падарунак чырвоны эшалён, адрамантаваны ў парадку баявога заданьня. Дэманстрацыі працягваліся да позьняга вечара.

У Ленінградзе дэманстрацыі пачаліся в 2-х гадзін дня і працягваліся да позьняга вечара. Усюды ўхвалены рэзалюцыі, якія заяўляюць аб гатоўнасьці працоўных СССР па першым закліку партыі і ўлады стаць на абарону заваёў Кастрычніка. Працоўныя ганьбяць ангельскі «рабочы» ўрад, які працягвае палітыку Чэмбэрлена ў адносінах да СССР. У Балахоўскай акрузе буйныя саўгасы ў дзень 1-га жніўня далі дзяржаве 12 вагонаў хлеба.

У дэманстрацыі 1-га жніўня ў Харкаве прыняло ўдзел 250.000 чалавек; у Запарожжы — 40.000 і ў Кіеве — 100 т

ШТО ДАУ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ ЗА МЯЖОЙ

САЦЫЯЛ-ЦЭРГІБЭЛІ АБЯЦАЛІ „ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЭНЭРГІЧНА"

Буржуазія дрыжыць перад гневам эксплёатуемых

Сацыял-Цэргібэлі і..

Напярэдадні 1-га жніўня ў Лёндане

АРЫГІНАЛЬНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ

ЛЁНДАН, 31. Падрыхтоўка да чырвонага дня ў Англіі набыла ў працягу апошняга тыдня асабліва шырокія разьмеры. Усюды склікаліся мітынгі, пашыраліся лістоўкі, наладжваліся дэманстрацыі.

У Лёндане сёньня карыстаўся вялікім посьпехам новы агітацыйны прыём: група камуністых заняла месца ў імпэрыяле аўтабусу, пры чым усе яны прыкавалі сябе ланцугамі да сядзеньняў, каб іх не маглі вывесьці з аўтабусу. Калі аўтабус адыйшоў ад пачатковай станцыі, на імпэрыяле былі разгорнуты сьцягі пад гукі рэвалюцыйных песьняў. Нязвычайнасьць гэтага відовішча прыцягнула ўвагу вялікіх мас народу. Калі аўтабус спыніўся ля Трафальгарскверу, яго абкружылі тысячныя натоўпы. На загаду паліцыі, аўтабус быў адпраўлены ў Сконтлэн-Ярд (паліцэйскае кіраўніцтва), дзе прышлося перапілаваць ланцугі, якімі прыкавалі сябе ўдзельнікі гэтай арыгінальнай дэманстрацыі. Пры гэтым была арыштавана адна жанчына па абвінавачаньні ў «нападзе на агентаў паліцыі».

Камсамольцы актыўна пашыралі сёньня антыімпэрыялістычную літаратуру ў раёне ваенных казарм заходняй часткі Лёндану. Прыбыўшая на месца паліцыя канфіскавала літаратуру.

Дэманстрацыя камсамолкі ў залі суду

ЛЁНДАН, 1. Арыштаваны ўчора ў часе дэманстрацыі на імпэрыяле аўтабусу камсамолка Сара Бэрль была зараз-жа перадана суду, які адбыўся ўжо сёньня раніцаю. У часе агалашэньня абвінаваўчага акту адна з прысутных у зале суду жанчын вітала падсудную воплескамі, за што была выведзена з залі. Судзьдзя прыгаварыў Сару Бэрль да штрафу ў разьмеры 40 шылінгаў (каля 20 руб.)

Пасьля абвянчэньня прыгавору Сара Бэрль не пакінула свайго месца, але ўчапілася за краты лаўкі падсудных і засьпявала Інтэрнацыянал, які быў падхоплен прысутнай у залі публікай. Заля была ачышчана паліцыяй, але вышаўшы з суду публіка наладзіла на вуліцы перад будынкам суду мітынг, які быў разагнаны паліцыяй.

Забарона дэманстрацыі ў Латвіі

РЫГА, 29. Зроблена шмат вобыскаў і рад арыштаў. Газэта левых прафсаюзаў «Страднэкс ун Зэнэкс» закрыта на нявызначаны час. Міністар унутраных спраў заявіў, што ніякіх дэманстрацый, да якіх заклікаюць камуністыя, ні ў Рызе, ні наогул у Латвіі дапушчана ня будзе. Усе спробы, нават самыя нязначныя, будуць спынены самым рашучым чынам.

„Паліцыя будзе дзейнічаць энэргічна"

БЭРЛІН, 31. Хаця першамайскі вопыт у Бэрліне паказаў немэтазгоднасьць забароны камуністычных сходаў, усё-ж у Гамбургу, Нюрэнбэргу і ў Мюнхэне ўжо абвешчана аб забароне ў дзень 1-га жніўня ўсіх сходаў. Мангэймская паліцыя забараніла назначаную на 3 і 4 жніўня міжнародную канфэрэнцыю рабочых. Гамбургская паліцыя канфіскавала нумар камуністычнага органу «Гамбургер Фолксцэйтунг», але толькі пасьля таго, як нумар большай часткаю быў ужо распраданы. Повадам для канфіскацыі паслужыла вымушэньне артыкулу аб выторвачасьці ваеннае амуніцыі на паасобных прадпрыемствах.

«Дэйтшэ Альгемэйне Цэйтунг» друкуе на відным месцы паведамленьне аб прысылцы бэрлінскім паліцэй-прэзыдэнтам Цэргібэлем значных паліцэйскіх падмацаваньняў з правінцыі, бо ён лічыць магчымай сутычку паліцыі з больш значнымі групамі дэманстрантаў.

«Само сабою зразумела,—сказаў Цэргібэль,—што ў выпадку сутычкі паліцыя будзе дзейнічаць энэргічна. Прахожым рэкамандуецца трымацца ў баку ад дэманстрацый».

Адозва „Ротэ Фанэ"

БЭРЛІН, 31. «Ротэ Фанэ» зьмясьціла адозву да 1-га жніўня. Хто хоча дэманстраваць за імпэрыялістычную вайну, за браняносцы, за мільярдныя асыгнаваньні на рэйхсвэр, за атрутныя газы і за ваенныя крэдыты, той няхай ідзе за лёзунгамі партыі браняносцаў і Цэргібэляй.

Хто-ж хоча дэманстраваць супроць вайны, той павінен дэманстраваць пад сьцягам Лібкнэхта і Леніна.

Пралетарыят Францыі актыўна рыхтуецца да 1-га жніўня

ПАРЫЖ, 31. Напярэдадні міжнароднага чырвонага дня барацьбы з імпэрыялізмам «Юманітэ» публікуе адозвы да рабочых і сялян усяго сьвету выканкому Прафінтэрну, прэзыдыуму Сялянскага Інтэрнацыяналу і агульны маніфэст кампартыі Англіі, Францыі, Нямеччыны, Кітая, Японіі і Галяндыі, а таксама балканскай фэдэрацыі кампартыі і КІМ'у з заклікам да наладжваньня дэманстрацый супроць імпэрыялістычнай вайны.

Выканком унітарнай канфэдэрацыі працы заклікае працоўных Францыі адгукнуцца на заклікі масавымі забастоўкамі, заваяваньнем вуліц і дэманстрацыямі ў абарону штодзённых патрабаваньняў працоўных мас, супроць вайны ў абарону СССР, у абарону праў прафсаюзаў і ўсіх іншых рабочых арганізацый, за вызваленьне ўсіх палітычных зьняволеных і салдат, супроць фашысцкага тэрору і сацыял-рэфармістых.

На заводах і фабрыках парыскага раёну і ў іншых буйных прамысловых цэнтрах, а таксама ў каменна-вугальных басэйнах рабочыя масы актыўна рыхтуюцца да чырвонага дня. Пашыраецца рух у правінцыі. Рабочы зьезд у Блансі з удзелам дэлегатаў ад вугляко-паў, мэталістых і чыгуначнікаў, у прыватнасьці рабочых заводу Крэзо, ухваліў лёзунгі Камінтэрну да міжнароднага чырвонага дня і пастанавіў далучыцца да маніфэстацыі 1-га жніўня.

Унітарны прафсаюз докэраў Бардо наперакор правакацыйным паведамленьням буржуазнага і сацыялістычнага друку аб адмаўленьні докэраў удзельнічаць у дэманстрацыях заяўляе, што рэвалюцыйныя докэры Бардо пасьледуюць заклікам Прафінтэрну і ўнітарнай канфэдэрацыі працы.

Канцэнтрацыя паліцыі і жандармэрыі ў Празе

ПРАГА, 31. У праскіх прыгарадох адбыліся зноў рабочыя сходы і дэманстрацыі. Некаторыя з іх расьсеяны паліцыяй. Зьявіліся нелегальныя выданьні камуністычных газэт «Рудэ Право», «Вечэрніц», «Форвэртс» і «Інтэрнацыянале», у якіх надрукаваны маніфэст антываеннага камітэту. Газэты распаўсюджваюцца на заводах. Вобыскі ў сакратарыяце ЦК кампартыі Чэха-Славакіі і арышты партыйных работнікаў працягваюцца. У Мараўскім Востраве арыштавана 107 партыйных работнікаў.

ВЯЗЬНІ ФРАНЦУСКАГА КАПІТАЛУ

Супрацоўнікі «Юманітэ» арыштаваныя паліцыяй перад 1-м жніўня. Т. т. Мацью, Мідоль, Сачдо, Дзюдзільe, Маз'ер

...іх „падрыхтоўка" да 1-га жніўня

На 9 год катаргі засуджан рэдактар „Юманітэ"

ПАРЫЖ, 31. Адказны рэдактар «Юманітэ» Дэні прыгавораны да 9 год турэмнага зьняволеньня і да ўплаты штрафу ў 9.000 франкаў за апублікаваньне антываенных артыкулаў у органах францускай кампартыі і камсамолу—у «Юманітэ», «Авангард» і «Казэрн».

Загад загрэбскай паліцыі

ВЕНА, 31. У Загрэбе, у сувязі з міжнародным чырвоным днём, паліцыя разьвівае ліхаманкавую дзейнасьць. Усюды шукаюць камуністычных арганізацый. Паліцыя захапіла адну тысячу нумароў органу нелегальнага югаславскага камсамолу «Малады Вальшавік». У будынку ЦК выкрыта 3.000 адозваў. У Загрэбе арыштавана каля 100 рабочых і студэнтаў па падазрэньні ў прыналежнасьці да кампартыі. Апублікаваны загад, які прадпісвае рабоч

Манэўр беларускіх сацыял-фашыстых

У нашым друку ўжо паведамлялася аб правале «зьезду» ТБШ, скліканага 9 ліпеня ў Вільні беларускімі нацыянал-фашыстымі, відомымі пад назваю «Беларускай санацыі». Як відома па гэтым «зьезьдзе», які быў дазволены фашысцкай уладаю і на якім прысутнічалі выключна прыхільнікі нацыянал-фашыстых, — аднагалосна былі выбраны ў Галоўную Управу т-ва ўсе тыя асобы, якія ўжо выбраны масамі па нелегальным зьезьдзе т-ва 21 мая. З усіх польскіх газэт адзін толькі «Дз. Віленскі» адгукнуўся на гэты факт. У заметцы пад загалоўкам «Зноў паражэньне санацыйнай палітыкі» «Дз. Віленскі» пісаў наступнае:

— 9 ліпеня адбыўся ў Вільні агульны зьезд членаў беларускага асьветнага т-ва «Школа», на які прыбыла каля 100 чалавек (у сапраўднасьці толькі 23).

Кіраваў «зьездам» былы грамадавец Антон Луцкевіч.

Выбрана новая ўправа т-ва, а таксама наглядальная рада, у склад якіх увайшлі дэпутаты беларускага Сяймска-Работніцкага клюбу: Вальпец, Дварчанін, Грэцкі, Крынчык, а таксама п. п. Пяткун, д-р. Марцінчык, Лябецкая, Ламашэвічанка і інш. Як відаць перамага камунізуючая група т-ва. «Санацыя», якая ў працягу некалькіх месяцаў рабіла намаганьні, каб зьнішчыць у т-ве камуністычныя ўплывы, панесла поўнае паражэньне.

Санацыйная група членаў т-ва «Школа», якая кіравала управай ад часу ліквідацыі «Школы» у кастрычніку мінулага году і потым пасьля легалізацыі «Школы» — зусім не ўвайшла ў склад новай управы.

Такім чынам управа зноў была апанавана тымі самымі асобамі, якія ў сваім часе былі абраны на нелегальным зьезьдзе т-ва ў Вільні.

Што-ж сапраўды азначае гэты факт? Ці ён сапраўды азначае паражэньне беларускіх нацыянал-фашыстых, як гэта піша «Дз. Віленскі», ці тут хаваюцца махінацыі ворага, ці гэта толькі манэўр? Вось на гэтае пытаньне мы пастараемся і даць адказ.

Па-першае, што да самога зьезду. Гэта быў ня зьезд, як назвалі яго самі нацыянал-фашыстыя, а хутчэй якаясьці нарада або сходка але ні ў якім разе— ня зьезд. Ня гледзячы на тое, што пра падрыхтоўку гэтай сходкі масы ведалі даўно, не гледзячы на актыўнае падтрыманьне яе з боку фашысцкага ўраду, — на гэту сходку зьявілася толькі 23 асобы — выключна беларускіх здрадніка ў і некалькі дарагіх гасьцей—дэпутатаў пілсудчыкаў. На зьезьдзе зусім адсутнічалі дэлегаты з правінцыі. Нават самі арганізатары сходкі прызналі гэта і ўказвалі на поўную адсутнасьць прадстаўнікоў ад правінцыяльных арганізацый.

Вось гэтая поўная адсутнасьць дэлегатаў з вёскі і паказала беларускім нацыянал-фашыстым, што яны зусім абанкруталі ў вачох працоўных мас, выкінуты за борт шырокіх мас. Каб канчаткова не парваць з масамі, каб не спаліць назаўсёды мост паміж сабою і імі, каб канчаткова ня зьнішчыць магчымасьцяй доступу да іх у далейшым, беларускія нацыянал-фашыстыя і рашыліся на гэты крок — на зданлівую капітуляцыю перад воляю працоўных мас. Нацыянал-фашыстыя толькі «узялыя за горла», як казаў старшыня сходкі, з скрэжатам зубоў і ў бясьсільнай злосьці прызналі Галоўную Управу і зьезд, які выкінуў іх з ліку членаў т-ва.

Аднак, тут трэба адзначыць, што пацьверджаньне гэтаю сходкаю Галоўнай Управы т-ва, абранай на зьезьдзе 21-мая, **зусім не азначае прызнаньня імі сваёй віны і шкодніцкай сваёй папярэдняй працы для беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Гэта прызнаньне** Галоўнай Управы **не зьяўляецца адмоваю названай групы ад далейшай працы на карысьць польскага фашызму.**

Прызнаньне беларускімі нацыянал-фашыстымі правоў Галоўнай Управы ТБШ **ні ў якім выпадку не зьяўляецца выразам спыненьня або адмовы і асуджэньня сваёй шкодніцкай дзейнасьці, а наадварот зьяўляецца манэўрам, які мае на мэце ратаваньне сябе ад поўнага зьнішчэньня, ад палітычнай сьмерці. Гэты манэўр накіраваны на дэзарыентацыю працоўных мас, каб паслабіць барацьбу іх супроць сябе, паслабіць іх пільнасьць, каб пасьля праз некаторы час зноў павесьці сваю разлагаючую здрадніцкую работу.**

У заключэньне можна сказаць, што гэты факт азначае не капітуляцыю ў поўным сэнсе значэньня гэтага слова, а толькі часовае адступленьне з поля боя з мэтаю выратаваньня сябе ад грамадзкай і палітычнай сьмерці, каб пры ўдобным моманце нанесьці новы ўдар беларускаму нац.-рэвалюцыйнаму руху.

Але мы упэўнены, што працоўныя масы Зах. Беларусі добра разумеюць гэты манэўр здрадніка ў.

С. Ж.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У радзе раёнаў скончана праверка вясковых парт'ячэек

ЯК МАГА ПАЎНЕЙ АБАГУЛІЦЬ МОМАНТЫ, ВЫЯЎЛЕНЫЯ ПРАВЕРКАЙ І ВЫКАРЫСТАЦЬ ІХ ДЛЯ ПАЛЯПШЭНЬНЯ ЎСЯЕ ПРАКТЫЧНАЕ ПАРТРАБОТЫ НА ВЁСЦЫ—АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ЯЧЭЕК

Шырока выкарыстаць вопыт

Аб некаторых недахопах у працы праверкомаў

Праца па чыстцы радоў КП(б)В на поўным ходу. Па ўсёй Беларусі ў хуткім часе заканчваецца праверка вайсковых і вясковых партячэек. На чарзе наступныя групы ячэек: савецкія і вытворчыя.

Тым больш цяпер неабходна выправіць асобныя недахопы, якія заўважаны ў іх працы.

Некаторыя праверкомы (напрыклад, Чэрвеньскі) **прыступілі да працы не ўпаўне падрыхтаванымі.** Чэрвеньскі праверком слаба азнаёміўся з станам арганізацыі і падрыхтоўкай яе да чысткі. Не правялі пленуму райкому, ня вывучылі ўсіх матар'ялаў на асобных членаў партыі. Праверком толькі адзін дзень аддаў падрыхтоўцы ў тэй час, калі ў іншых раёнах праверкомы вызначалі на падрыхтоўку 5-6 дзён. У зьвязку з гэтым, калі праверком прыступіў да чысткі першай ячэйкі і сустрэўся з справамі асобных членаў партыі, ня змог абгрунтаваць свае пастановы па гэтых справах. Хаця дзякуючы кіраўніцтву АКК, усе гэтыя недахопы былі своечасова выпраўлены, і Чэрвеньскі праверком сваю працу скончыў здавальняюча. Мы на гэтым спыняемся, каб папярэдзіць іншыя праверкомы ад гэткіх памылак.

Другі вялікі недахоп. Многія райкомы і ячэйкі не зразумелі асноўнай задачы чысткі партыі ў вёсцы, як задачу арганізацыі вакол партыі с.-г. рабочых, батракоў і беднякоў, каб з іх дапамогай, апіраючыся на іх, правесьці адбор важакоў мас, лепшых камуністых у вёсцы і адсеяць нятодны і клясава-варожы элемант, а таксама неабходнасьць адначасова ўцягнуць у партыю батракоў і беднату.

У радзе месц (Грэскі, Заслаўскі і інш. раёны, Менскай акругі, у Мазырскай, Аршанскай і інш. акругах) батрацтва і беднота аказаліся неарганізаванымі, непадрыхтаванымі да чысткі і ў зьвязку з гэтым не змаглі даць належны адпор кулацтву.

З боку асобных праверкомаў ня было зьвернута дастаткова ўвагі вывучэньню пытаньня, **якія іменна клясавыя праслойкі ў вёсцы праяўляюць найвялікшую актыўнасьць** і якія матывы гэтай палітычнай актыўнасьці. З боку праверкомаў ня былі прыняты меры для таго, каб на чале шырокага садзейнічаньня чысткі сталі арганізаванае партыйай батрацтва і беднота супроць імкненьняў кулацтва і клясава-варожых сіл вёскі.

ЦКК КП(б)Б прапанавала паставіць гэту задачу ў аснову працы праверкомаў шляхам самай шырокай напярэдняй працы па прыцягненьні да чысткі перш за ўсё батрацтва і беднаты і ўстанаўленьні вучоту прысутных на сходах па чысткі і выступаючых на іх—па сацыяльных адзнаках (батрак, бядняк, серадняк і г. д.).

Асобныя праверкомы невыстарчальна, ўвязваюць працу па чысткі з праверкай усёй працы ячэек. **Таму ў** матар'ялах праверкомаў няма дастаткова-га адлюстраваньня стану і працы ўсёй ячэйкі.

У працы **некаторых** праверкомаў (Бабруйск. і інш. акр.) мела месца сьпешка. Тры ячэйкі правяраліся на працягу 5 дзён. Зразумела, што калі на адну ячэйку вызначыць ўсяго 1-2 дні—праверком ні ў якім разе ня зможа ў сапраўднасьці яе праверыць. ЦКК у свой час прапанавала Бабруйскай АКК і АК прыняць меры да таго, каб дырэктывы ў гэтым напрамку правільна выконваліся, а таксама даручана было зараз-жа выправіць практыку працы асобных праверкомаў, дзе гэтыя хібы мелі месца.

З іншых характэрных парушэньняў адзначым спробы некаторых праверкомаў чыстку абярнуць у палітэкзамены. Адна праверачная камісія дапытвала кандыдата партыі-батрака:

— Якія вы ведаеце легальныя, паўлегальныя і нялегальныя партыі?..

— Што пастанавіў 1-ы Кангрэс Камінтэрну?

Другая праверкамісія ставіла на праверцы такія пытаньні:

— Ці выпіў-бы ты, калі-б табе падносьлі?

Устаноўлены яшчэ асобныя выпадкі (Чаусы, Магілёўск. акр. і інш.), калі праверкомы агаласілі свае вывады на зачыненых сходах ячэек. АКК своечасова рэагавалі на гэтыя моманты і, не зацьверджаючы вынікаў, прапанавалі праверкомам паўторна выехаць на месцы і паставіць іх на абгаварэньне адчыненых сходаў ячэек з удзелам беспартыйных.

Віцебскай АКК прышлося сустрэцца з недаацэнкай з боку аднаго праверкому антыпартыйных учынкаў партыйца. Так, праверком пакінуў у партыі без вынясеньня партспагнаньняў партыйца, які ня спыніў з 1924 г. алязыцыйнай дзейнасьці. АКК адмяніла рашэньне праверкому і выключыла апазыцыянэра з партыі.

Акрамя апошняга прыкладу, АКК не зацьверджала пастаноў праверкомаў і ў такіх выпадках:

Калі ёсьць пяяспасьці, недастаткова абгрунтаваны пастановы праверкому (як матывіровачная, так асабліва пастановачная частка); пры неадпаведнасьці фармулёровак абвінавачваньня характару накладзенага спагнаньня; пры паступленьні ў АКК новых матар'ялаў і неабходнасьці дадатковага высьвятленьня абвінавачваньняў.

У пачатку чысткі некаторыя АКК вымушаны былі даручаць асобным праверкомам зноў пераапрацоўваць свае пратаколы, якія супярэчылі інструкцыі ЦКК УсеКП(б).

Таковы найбольш тыповыя недахопы, заўважаныя ў працы праверкомаў. Іх трэба, зразумела, для карысьці найбольш пасьпяховага праведзеньня гэнэральнай чысткі партыі, як мага хутчэй зьнішчыць.

М. З.

Урокі праверкі трох арганізацый

Большасьць ячэек не распрацавала інструкцыі. — Арганізацыйна тэхнічная непадрыхтаванасьць Р. К. і ячэек тармазіла работу камісій.— У праверяных арганізацыях амаль адсутнічае партвыхаваўчая работа.—Батракі і с.-г. рабочыя ўступаюць у партыю.

Скончылася чыстка і праверка 8 раённых партарганізацый па Менш чыне. Чыстка прайшла пры актыўным удзеле сялянскае беднаты, батрацтва і серадняко ў. Яна ператварылася ў масавы агляд усяе работы парт. арганізацый. З практыкі праверкі трох арганізацый: **Астрашыцка- Гарадзецкай, Смалявіцкай і Лагойскай** можна зрабіць некаторыя вывады.

Партарганізацыі да чысткі не падрыхтаваліся. Падрыхтоўка насіла сухі і казённы характар. Замест шырокай агітацыйна-масавай работы праводзіліся сухія і штаблённыя даклады аб чысткі. Масы ня былі ўцягнуты ў падрыхтоўчую работу. Асобныя партарганізацыі зусім ня склікалі сходаў батрацтва і беднаты. Беспартыйныя с.-г. рабочыя, батракі і сяляне-беднякі ня ведалі асноўных задач чысткі.

Смалявіцкая арганізацыя не правяла ніякай агітацыйнай работы сярод сялянства. Раённы сход, заслухаўшы даклад аб чысткі, прыняў адпаведную рэзалюцыю. Раённы камітэт разаслаў па ячэйках абежнікі і... на гэтым усё скончылася. Ячэйкі заплацілі даніну нашай прадукцыйнай расхлябанасьці і няўважлівым адносінам да адказнай справы. Інструкцыя ЦКК УсеКП(б) аб чысткі партыі загінула ў нэтрах ячэйкавых пратаколаў. **Амаль ніводная ячэйка інструкцыю не прапрацавала.** Тыя ячэйкі, што прапрацавалі інструкцыю, правялі гэта фармальна, казённа. Ячэйкі абмежаваліся толькі тым, што зацьвердзілі рэзалюцыю: «Прыняць да ведама». Асобныя ячэйкі зусім не рыхтаваліся да чысткі, і толькі тады, калі стала вядомым, што хутка ў Смалявічы прыедзе камісія па чысткі, ячэйкі правялі даклады. Сумныя факты. Факты, якія сьведчаць аб поўнай непадрыхтаванасьці да чысткі ўсёй партарганізацыі. І такія факты бываюць часта. У радзе іншых арганізацый падрыхтоўчая работа праведзена таксама дрэнна.

Лагойская арганізацыя не змагла прыцягнуць рабселькораў да ўдзелу ў праверачных сходах. Селькоры ня былі праінструктаваны. Ня было выстарчальнага парткіраўніцтва ў рабселькораўскай работе. Усе шматлікавыя пастановы аб мабілізацыі рабселькораўскай армії не далі жадных вынікаў. Увогуле амаль ніводная партарганізацыя нічога не зрабіла для прыцягненьня рабселькораў у падрыхтоўчую работу да праверачных сходаў.

Астрашыцка-Гарадзецкі раённы камітэт слаба правёў арганізацыйна-тэхнічную падрыхтоўку. Райком не зрабіў ніякіх дакладаў да збору матар'ялу. Асабістыя справы і вучотныя карткі камуністых знаходзіліся ў беспарадку. Бязгрудзіца і блытаніна панавалі ў дакумантах аб сацыяльным і колькасным складзе арганізацыі. Гэта **тэхнічная непадрыхтаванасьць значна затармазіла работу камісіі.** На апошнім факце мы павінны завастрыць увагу партарганізацыі. Ва ўсіх раённых камітэтах асабістыя справы і вучотныя карткі партыйцаў знаходзяцца таксама ў непарадку. Няма ніякай правільнасьці ў вядзеньні гэтых важнейшых партыйных дакумантаў. Такія чынаўніцкія адносіны да партдакумэнтаў ставяць пад сумненьне статыстычныя весткі раённых арганізацый аб сваім сацыяльным складзе і перашкаджаюць рабоце камісіі. Арганізацыі павінны **зараз-жа ўрэгуляваць гэтае пытаньне.**

Чыстка паказала, што арганізацыі хварэюць адным агульным недахопам. Культурна-масавая работа, палітычнае выхаваньне партыйцаў, масавая агітацыя сярод сялянства пастаўлены слаба. Палітвучоба зьяўляецца самым слабым месцам у рабоце партарганізацыі.

Смалявіцкая арганізацыя несваечасова прапрацавала пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), XII зьезду КП(б)Б і XVI партканфэрэнцыі. Асобныя ячэйкі Астрашыцка-Гарадзецкай партарганізацыі—яшчэ да апошняга часу гэтых пастаноў не прапрацавалі. Слабасьць культ-масавай работы і палітычная няпісьменасьць партыйцаў прывяла да таго, што асобныя ячэйкі апынуліся ў палоне п'янства. Частка камуністых зусім ня цікавіліся жыцьцём партыі і сьвядома не жадала палянпшаць сваю тэарытычную падрыхтоўку.

Павальнае п'янства ў ячэйках Астрашыцка-Гарадзецкай арганізацыі, бытавое разлажэньне часткі камуністых, скажэньне клясавай лініі і г. д. тлумачыцца толькі тым, што ў арганізацыі зусім заняпала палітвыхаваўчая работа. Кіруючы партактыў, кіраўнікі райкому і сакратары ячэек п'янствавалі, сябравалі з кулакамі, скажалі клясавую лінію. Новы партактыў, папоўнены сьвежымі сіламі, змог павесьці рашучую барацьбу з п'янствам і інш. антыпартыйнымі ўчынкамі. Арганізацыя вышла на новы шлях з абноўленымі і сьвежымі сіламі. Але, факт застаецца фактам. Галоўны небясьпечны недахоп вясковых партарганізацый—слабасьць палітычнага выхаваньня партыйцаў яшчэ ляжыць вялікім цяжарам на шмат якіх ячэйках. Камісія па чысткі Смалявіцкай партарганізацыі сустрэлася з фактамі павальнага п'янства сярод камуністых некаторых парт'ячэек. (юр'еўская і жыжэлкаўская). У гэтых ячэйках не праводзілася ніякая палітычна-выхаваўчая праца. У **Папярнянскай** ячэйцы (Астрашыцка-гарадзецкая партарганізацыя) палітвучоба сярод кандыдатаў заняпала. У выніку кандыдаты зап'янствавалі. У **беларуцкай і пчальнянскай** ячэйках тэй-жа арганізацыі замест работы панавала склочніцтва. Прычына: ня было ніякай культурна-грамадзкай работы, тэарытычна партыйцы былі няпісьменныя.

Мы павінны зрабіць вывад—**вясковыя партарганізацыі павінны зрабіць усе захады да павышэньня палітычнага ўзроўню сваіх членаў.**

Па ўсіх трох арганізацыях чыстка выклікала вялікую актыўнасьць мас. Чыстка ўзварушыла масы, узняла іх палітычную актыўнасьць, узмацніла аўтарытэт партыі ў вачох беспартыйных с.-г. рабочых, батракоў і бедняцка-серадняцкіх мас вёскі.

У выніку чысткі з 69 членаў Астрашыцка-Гарадзецкай арганізацыі 17 выключаны, большасьць за скрыўленьне клясавай лініі, за сувязь з кулаком і сыстэматычнае п'янства. У Лагойскай партарганізацыі выключана з партыі 12 чалавек. Сходы ячэек поўнасьцю адобрылі ўсе пастановы камісіі.

Выступленьне беспартыйных сялян на сходах насіла выключна практычны аб'ектыўны характар. Беднота імкнулася дапамагчы камісіі выкрыць усе недахопы і праверыць работу ячэек. Беспартыйныя і батракі, і беднякі выходзілі на трыбуну і актыўна выказваліся па ўсіх моментах работы ячэек, хвалілі тых камуністых—энтузіястых, якія выразна праводзяць клясавую лінію, абараняюць батрацтва-бядняцкія інтарэсы, уласным прыкладам агітуюць за ўздым ураджайнасьці і калектыўзацыю. І выкрывалі тых, хто выпадкова трапіў у партыю, хто страціў клясавую чуласьць і зьвязаўся з кулацкімі элемэнтамі.

Рабочыя саўгасаў і батракі, калгасьнікі, камунары, беднота і сераднякі, выступаючы на сходах, заявілі, што чыстка яшчэ больш наблізіла іх да партыі. Лепшыя з іх тутжа на сходах падавалі заявы аб прыняцьці ў партыю. Па трох арганізацыях у часе чысткі падало заявы аб прыняцьці ў партыю **некалькі дзесяткаў сельгасрабочых і батракоў.** Прыцёк заяў ня спыняецца... Новыя кадры с.-г. рабочых і батракоў бязупынным патокам уліваюцца ў рады КП(б)В.

Ю. Т.

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ

Парадак узносу плацяжоў за 3-ю пазыку індустрыялізацыі

МАСКВА, 1. З прычыны таго, што калектыўная падпіска працоўных на 3-ю пазыку індустрыялізацыі пачалася датэрмінова і паасобныя прадпрыемствы мяркуюць скончыць падпіску ў пачатку жніўня, Наркамфін СССР устанавіў парадак узносу плацяжоў па падпісцы з растэрмінаваньнем звыш 10 месяцаў.

Калектывы, якія пачынаюць плацяжы за аблігацыі ў пачатку жніўня могуць атрымаць фактычнае растэрмінаваньне ў 11 месяцаў, са жніўня 1929 г. па ліпень 1930 году. Калектывы па сваім жаданьні могуць аплаціць аблігацыі ў працягу 10 месяцаў і пры ўмове, калі першы ўзнос зроблены ў жніўні. У гэтым выпадку, усе разьлікі па падпісцы могуць быць закончаны да 1-га ліпеня. Крэдытныя ўстановы, згодна заявы калектыву аб жаданьні атрымаць гое або іншае растэрмінаваньне, устанаўліваюць для кожнага калектыву адпаведны парадак аплаты аблігацый і паведамляюць калектывам аб тэрмінах і разьмерах плацяжоў, што належаць з іх па падпісцы.

У зьвязку з хлебазагатоўчай кампаніяй у раёне інтэнсіўных хлебазагатовак разьмяшчэньне пазыкі сярод сялянства павінна быць распачата ўжо са жніўня месяца, шляхам продажу аблігацый у растэрмінаваньне за гатоўку. Продаж аблігацый 3-е пазыкі сялянам за гатовыя грошы павінен адбывацца ў працягу ўсяго жніўня па цане, устаноўленай на 1-га верасьня 1929 году — па 47 руб. 90 кап. за цэлую 50-ці рублёвую аблігацыю. Продаж аблігацый сялянам у парадку падпіскі з растэрмінаваньнем плацяжу адбываецца ў працягу жніўня па нарыцацельнай цане.

САМАЛЁТ „КРАІНА САВЕТАЎ" РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫЛЕТУ

Першы у гісторыі авіяцыі пералёт над Ціхім акіянам

МАСКВА, 1. Вылёт самалёту «Краіна Саветаў» адбудзецца не пазьней 5-га жніўня. Усе падрыхтоўчыя работы па пералёту ў тым ліку і наладжваньне баз на шляху скончаны. Зробленыя выпрабаваньні паказалі добрыя якасьці машыны і дасканалую работу матораў. Маршрут «Краіны Саветаў» застаецца ранейшым: Масква—Новасібірск—Хабараўск— Петрапаўлаўск-на—Камчатцы — Сан-Францыска — Чыкага-Нью-Ёрк. Агульная працягласьць маршруту — 19600 кілёмэтраў, з якіх 11650 кілёмэтраў сухаземнага пуці і 7950 кілёмэтраў марскага шляху. Палёт над морам і сушай зьяўляецца асаблівасьцю данага пералёту, бо самалёт будзе зьмяняць калёсы на паплаўкі ў Хабараўску і другі раз мяняць паплаўкі на калёсы ў Сан-Францыска.

Паказаны маршрут яшчэ нікім поўнасьцю ня выкананы. Пералёт над Ціхім акіянам ад Петрапаўлаўска да Алеўцкіх выспаў будзе зроблены ўпершыню ў гісторыі авіяцыі. Пералёт прадстаўляе вялікія трудасьці з пункту погляду мэтэаралёгічных і аэра-навігацыйных умоў.

Самалёт «Краіна Саветаў» зроблены паводле праекту інжынэра А. Н. Туполева з савецкага кальчук - алюмінія. У пералёце прымуць удзел: першы лётнік т. Шастакоў, другі лётнік тав. Золатаў, аэра-навігатар т. Бэрлікаў і мэханік т. Фуфаеў.

Досьледы пасеваў эгіпэцкае і амэрыканскае бавоўны

МАСКВА, 1. Аграном Шагаеў з посьпехам правёў у Фэргане досьледы пасеваў эгіпэцкае і амэрыканскае бавоўны спосабам перасадкі. У 1929 годзе тав. Шагаевым было засеяна спосабам перасадкі на дэхканскіх палёх 27 гектараў, з якіх 21 амэрыканскай і 6 эгіпэцкай бавоўнай. Досьледы паказалі, што пасевы перасадачнай культуры даюць значна больш высокую ўраджайнасьць, чым звычайныя пасевы. Падлік затрат па досьледах тав. Шагаева паказвае таксама, што перасадачная культура бавоўны зьяўляецца эканамічна зусім рэнтабэльнай. Прэзыдым ВСНГ СССР прызнаў, што досьледы агранома Шагаева поўнасьцю пацьвярджаюць магчымасьць прыступіць у бліжэйшы час да масавага разьвядзеньня ў СССР спосабам перасадкі эгіпэцкай і амэрыканскай бавоўны.

Прэзыдыум запрапанаваў «Главхлопку» засеяць гэтым спосабам у 1929-30 г. эгіпэцкае і амэрыканскае бавоўны ня менш 4025 гект. Пастаноўлена абсьледаваць вынікі разьвядзеньня бавоўны спосабам перасадкі таксама на Украіне. Прэзыдыум пастанавіў выдаць аграному Шагаеву ўзнагароду ў 3.000 руб.

Літаратура да „Дня Індустрыялізацыі"

Рабочая кляса пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі паўхільна разгортвае сацыялістычнае будаўніцтва, шпаркім тэмпам праводзіць індустрыялізацыю краіны. Ініцыятыва і энтузіязм рабочых мас паказвае вялікія прыклады працоўнага гэраізму, паказвае ўпартасьць барацьбы мас за справу сацыялістычнага перабудаваньня народнае гаспадаркі СССР. Ініцыятывай саміх рабочых 6-га жніўня г. г. праводзіцца ўсесаюзны «Дзень індустрыялізацыі», дзень сацыялістычнае працы рабочае клясы для хутчэйшай індустрыялізацыі краіны.

«Дзень індустрыялізацыі» павінен таксама паслужыць і для ўсьвядомленьня шырокімі рабочымі масамі задач, пастаўленых партыяй перад краінай, асьвятленьня трудасьцяй і недахватаў, што сустракаюцца пры іх выкананьні і адшуканьня спосабаў іх зьнішчэньня і перамаганьня.

Атляд кніг, якія прапануюцца па пытаньнях індустрыялізацыі, павінен дапамагчы перадавіку рабочаму прапрацаваць усе пытаньні, зьвязаныя з задачай індустрыялізацыі СССР. Задача індустрыялізацыі краіны, як асноўная задача рабочае клясы, як генэральная лінія партыі знайшла найбольш яскравае адлюстраваньне ў работах XIV і XV партзьезду, што выдзелена як у дакладзе ЦК УсеКП(б) XV зьезду партыі, так і ў рэзалюцыях зьезду. Пакажам на:

И. Сталин и Ст. Коссиор—отчет центрального комитета XV с'зда ВКП(б) (ГИЗ, 1928. Стр. 220. Ц. 28 к.) і

Резолюции и постановления XV с'езда ВКП(б). ГИЗ. 1928. Стр. 154. Ц. 20 к.

Наступныя пленумы ЦК УсеКП(б) поўнасьцю адбілі ў сваіх пастановах генэральную лінію партыі. Лістападаўскі пленум 1928 г. ЦК у дырэктывах па складаньні кантрольных лічбаў народнае гаспадаркі на 1928-29 год цалкам выходзіў з асноўнае пастановы XV партзьезду. Гл.

Резолюции ноябрьского пленума ЦК ВКП(б). ГИЗ 1929. Стр. 60. и **Молотов «К итогам ноябрьского пленума ЦК ВКП(б)»** ГИЗ. 1928. Стр. 46, Ц. 8 к.

Найбольш поўнае і канкрэтнае выяўленьне лёзунг індустрыялізацыі атрымаў у работах XVI Усесаюзнай парткнфэрэнцыі. Пяцігадовы плян, асноўны напрамак якога зацьверджаны XVI канфэрэнцыяй, палкам выходзіць з задач індустрыялізацыі краіны, цалкам улічвае задачы перабудаваньня сельскае гаспадаркі, паўнасьцю стаіць на пазыцыях наступленьня на капіталістычныя элементы гораду і вёскі.

Пакажам наступныя асноўныя матар'ялы:

XVI Всесоюзная партконференция — резолюции и постановления. (ГИЗ, 1929. Стр. 61 ц. 12 к.).

XVI Всесоюзная партийная конференция—пятилетний план развития народного хозяйства.—Доклады А. И. Рыкова, Г. М. Кржижановского, В. И. Куйбышева (ГИЗ. 1929. Стр. 140, Ц. 15 к.)

К. Бауман—Итоги об'единенного пленума ЦК и ЦКК и XVI Всесоюзной партийной конференции. (Изд. «Московский рабочий». 1929. Стр. 6, Ц. 10 к.).

В. Богушевский—Через 5 лет. (пособие для агитаторов, рекомендованное АППО ЦК ВКП(б). Стр. 191. Ц. 65 к.

Саюз Савецкіх рэспублік імкнецца да таго, каб разьвіваць у прамысловых і культурных адносінах гаспадарча адсталыя акраіны. Вынікам і задачам прамысловага разьвіцьця акраін прысьвечана брашура.

В. Сегаль—Индустриализация окраин. (ГИЗ. 1928. Стр. 88. Ц. 30 к.).

Пад уплывам некаторых гаспадарчых затрудненьняў сярод паасобных членаў партыі пасьля XV партзьезду пачалі праяўляцца ўхілы ў бок ад генэральнай лініі, пачалі праяўляцца тэндэнцыі да памяншэньня тэмпу індустрыялізацыі, да скарачэньня разгортваньня калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Паасобныя члены партыі пачалі выступаць супроць наступленьня на капіталістычныя элементы, замазваючы наяўнасьць абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне.

З літаратуры па даным пытаньні пакажам:

И. Сталин—Об индустриализации страны и о правом уклоне—речь на пленуме ЦК ВКП(б) 19 X 1928. (ГИЗ. 1928. Стр. 63. Ц. 10 к.).

А. Леонтьев—В борьбе за индустриализацию. (ГИЗ. 1929. Стр. 229. Ц. 45 к.)

Р. Е. Вайсберг—План и хозяйственные затруднения. (ГИЗ 1929. Стр. 133. Ц. 30 к.).

В. Милютин—О правом уклоне (ГИЗ. 1929. Стр. 39. Ц. 7 к.).

Тав. Сталін у вышэйпаказаным дакладзе разьбірае тры важныя пытаньні: аб індустрыялізацыі краіны і яе тэмпе, аб рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў сувязі з збожжавай праблемай і аб барацьбе на два фронты.

У брашуры т. Лявонцьцеў (з сэрыі «Библиотека журнала «Коммунистическая Революция») падрабязна разьбіраюцца асноўныя праблемы гаспадарчага будаўніцтва і даецца адначасова дэталёвая крытыка поглядаў правых.

Тав. Вайсбэрг—на падставе матар'ялаў на 1928-29 год разьбірае погляды правых па асноўных пытаньнях гаспадарчай палітыкі, разьбіраючы прычыны гаспадарчых затрудненьняў і шляхі іх зьнішчэньня.

Асьвятленьню тых-жа пытаньняў прысьвечана брашура т. Мілюціна. Перамаганьне трудасьцяй, што стаяць на шляху індустрыялізацыі краіны, магчыма толькі пры цьвёрдай ленінскай лініі партыі, на аснове вялікага ўздыму мас, іх творчай ініцыятывы, на аснове ўсямернага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Асноўнымі па даным пытаньні зьяўляюцца тры артыкулы.

Тав. Леніна—К вопросу о социалистическом соревновании. (ГИЗ. 1929 г. Стр. 64. Ц. 3 к.).

Гэтыя артыкулы дасканала выкрываюць вялікае значэньне сацыялістычнага спаборніцтва ў справе рэканструкцыі нашай краіны на сацыялістычных пачатках і павінны быць уважліва вывучаны кождым рабочым, асабліва рабочым-актывістым.

19 ЖНІЎНЯ--ДЗЕНЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Шырокія працоўныя масы ня толькі гораду, але і вёскі з вялікім энтузіязмам падхапілі прапанову ленінградзкага рабочага Слабодчыкава аб арганізацыі дня індустрыялізацыі. Нядаўна ў «Правду» быў пасланы ліст ад тысячы сялян Руднянскага раёну, Смаленскай акр. з прапановай на прыкладу Дня індустрыялізацыі правесьці на вёсцы дзень калектывізацыі і прыстасаваць яго да 19-га жніўня —рэлігійнага сьвята—«Спаса». Практычнае значэньне гэтай прапановы вялізарнае.

Белкалгасасаюз ужо прыняў пастанову, каб у БССР дзень 19-га жніўня абвясьціць днём калектывізацыі.

Дзень калектывізацыі на вёсцы павінен стаць днём папулярызацыі генэральнага гаспадарчага пляну партыі на вёсцы, днём далейшага ўзмацненьня змычкі рабочае клясы з сялянствам і ўзмацненьня клясавай барацьбы з кулацтвам.

Сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы разгорнута яшчэ вельмі слаба. Таму дзень калектывізацыі павінен даць вялікі штуршок сацыялістычнаму спаборніцтву на вёсцы. Дзень калектывізацыі павінен даць нам значную колькасьць новых калгасаў і ў першую чаргу буйных, арганізаваных, як шляхам уцягненьня шырокіх сялянскіх мас у новыя калгасы і перарастаньня прасьцейшых відаў у больш складаныя калектыўныя формы, так і шляхам узбуйненьня існуючых калгасаў.

Партыйныя, савецкія, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі на вёсцы павінны правесьці гэты дзень пад знакам далейшага рашучага згуртаваньня бядняцка-серадняцкіх мас за лінію партыі, за сацыялістычны шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі.

Усе сходы ў гэты дзень трэба прысьвяціць асеньняй пасеўнай кампаніі, калгаспаму будаўніцтву і ролі дня калектывізацыі ў пашырэньні калгаснага будаўніцтва.

Белкалгасасаюз ужо даў растлумачэньне на месцы наконт правядзеньня гэтага дня.

Дзень калектывізацыі зьяўляецца магутным фактарам у справе ўзмацненьня калгаснага будаўніцтва. Шырокія працоўныя масы павінны рэты дзень зрабіць днём штогадовага сьвята калгаснага руху.

А. САФАРЭВІЧ.

Што зроблена для арганізацыі садова-гароднай гаспадаркі

КАЛІ БУДЗЕ ВЫКАНАНА ДЫРЭКТЫВА ЎРАДУ

Чакаем адказу Менгарсавету і МЦРК

Умовы гарадзкой і прыгараднай мяжы г. Менску зьяўляюцца надзвычайна спрыяючымі і маюць багацейшыя магчымасьці менавіта для разьвіцьця гароднінцтва і садоўніцтва гэтых высока інтэнсыўных і самых прыбытковых галін сельскай гаспадаркі.

Такое становішча зусім правільна было ацэнена нашым урадам, калі ў выданай пастанове Эканамічнай Нарады пры СНК быў прадугледжан цэлы рад мерапрыемстваў па арганізацыі пладова-гароднага рынку і разьвіцьцю садова-гароднай гаспадаркі. Але, на жаль, трэба сказаць, што пастанова гэта пакуль што застаецца толькі пастановай, і мясцовыя органы яшчэ нічога не зрабілі да практычнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы. Вось чаму, каб не дапусьціць такіх нядбайных адносін і магчымасьці зрыву гэтай надзвычайна важнай справы, мы высоўваем перад Менскім гарсаветам, а разам з гэтым і перад усімі гарсаветамі БССР наступныя канкрэтныя мерапрыемствы:

Да практычнай працы па арганізацыі гарадзкой і прыгараднай садова-гароднай гаспадаркі трэба прыцягнуць усе зацікаўленыя ўстановы, як прыгарадныя сельсаветы, Менсельпром, сельгаскаапэрацыю, МЦРК, жылкааперацыю, акргандаль, вайсковыя часьці, школы і інш.

Практычнае ажыцьцяўленьне і непасрэднае кіраўніцтва гэтай справай трэба ўскласьці на земчастку гаркамгасу.

Далейшае разьвіцьцё садова-гароднай гаспадаркі павінна пайсьці галоўным чынам па шляху арганізацыі вытворчых садова-гародных арцеляў і калектываў. Земчастка гаркамгасу павінна зараз-жа намеціць і выдзяліць для рэарганізацыі гэтых аб'яднаньняў зямельныя вучасткі, указаўшы месцазнаходжаньня іх, плошчу, кароткую характарыстыку і ўмовы перадачы (сродкі арэнды, арэндную плату і г. д.). Асабліваю ўвагу павінна быць зьвернута па ар

1-га жніўня ў БССР

шматтысячныя калёны пралетараў, служачых і працоўнага сялянства пад сьцягамі КП(б)Б

дэманстравалі сваю гатоўнасьць аддаць усе сілы, усю энэргію сацыялістычнаму будаўніцтву і абароне СССР

ЖНІВЕНЬСКАЯ СЫМФОНІЯ

Першы жніўны дзень. Удумлівы, задішны... Безліччу сонечных бліскаў апырсканы вуліцы, рэклямы, сьцягі... Чырвань штандараў уладна перамагае ўсе фарбы.

На Пляц Волі непераможнымі хвалямі прыбіваецца натоўп. Гульлівыя стройныя калёны.

На вежы б'е 5 гадзін.

Рабочыя проста з прадпрыемстваў накіраваліся сюды працоўнай сям'ёй. Крок іх напружаны—цьвёрды, выгляд адважна-бадзёры.

Студэнцтва гарэзнаю масаю прайшло і рассыпала малады задор.

Мітынг. Пратэст супроць крывавых зданьняў мінулага, супроць пагрозы новай сусьветнай разьні... Пратэст глыбокі, агульны, усьвядомлены.

Пурпурам успыхваюць штандары. Многа лёзунгаў. Іх рытмічнае калыханьне нагадвае мэлёдыю жніўнае песьні.

З трыбуны, з бальконаў — прамовы. Усе імкнуцца падыйсьці бліжэй, каб пачуць нэгра, чорнага, як лёнданскія туманы. Слоў не разабраць, але яго пратэстуючыя гэсты, гнуткасьць і напружанасьць рухаў занадта красамоўны.

Піянэры ў захапленьні. 6-ці гадовы хлапчук зьдзіўлена пазірае прыпухлымі вочкамі і раптам зазначае: «Татка, я буду вучыцца на нэгра». Татка, вучыць яго салюту.

Мітынг не зацягнулі. Калёны накіроўваюцца да клюбу Карла Маркса. На вольную трыбуну набег хлапчукоў.

Грыміць аркестр за аркестрам. У бадзёрыя, уздымныя мэлёдыі прабіваецца блізкае ўсім сугучча—інтэрнацыянал. І ў im тая-ж вялікая сымфонія, пратэсту, той-жа лёзунг. Рукі проч ад СССР. Усе на абарону нашых заваёў, здабытых нясьцішнаю працаю, творчым парывам... Чырвоны міжнародны дзень...

Цяжка рухацца па вуліцах, узрытых, загружаных рэйкамі. Хутчэй на праложаныя шляхі...

Дэманстранты нясьлі пурпурныя штандары схіленымі — разьвітальны салют вялікаму дню.

Апошні раз успыхнуў лёзунг: «Проч мілітарыстых», і зьнік у безьліччы другіх.

Усямерна падтрымаем фонд абароны

ЗАСЛАЎЛЬ (наш кар.) Звыш 2 тыс. працоўных выйшла на вуліцу 1-га жніўня дэманстраваць сваю клясавую салідарнасьць в міжнародным пралетарыятам. Мітынг прайшоў в вялікім уздымам. У шматлікіх лёзунгах сяляне Заслаўшчыны выказалі свой рэзкі пратэст супроць пахрыхтоўкі крывавай бойні, супроць здрадніцкай палітыкі сацыял-фашыстых.

— Запэўняем сусьветны пралетарыят,—заявілі сяляне ў рэзалюцыі,—што мы кожную хвіліну гатовы выступіць на абарону адзінай у сьвеце пралетарскай краіны—СССР.

Абкружым любоўю і клопатамі Чырвоную армію

(На 25-ці тысячным мітынгу ў Менску)

Толькі скончыў гаварыць т. Аксючыц, як на бальконе гарсавету зьявіліся дэлегаты прадпрыемстваў і вайсковых часьцей, пасланыя дэманстрантамі. Чыгуначнікі, якія прышлі ў колькасьці 5 тысяч чалавек, дэлегавалі 2-х рабочых Барсукова і Путырскага, дэлегавалі, каб заявіць:

«Многія в нас некалькі год пакутавалі ў акопах, былі паранёны і кантужаны ў імпэрыялістычнай вайне. Яна вырвала з нашых радоў сотні лепшых рабочых. Мы не забылі жахаў сусьветнай бойні. І калі зараз імпэрыялістыя вноў рыхтуюцца да новай вайны, яшчэ больш жудаснай, чым мінулая, мы гаворым:

«Рукі—кароткія! Сусьветны пралетарыят не дапусьціць паўтарэньня 1914-18 г. Ён не дазволіць, каб на крыві і трупах нажываліся банкіры і фабрыканты.

—Імпэрыялістыя ў саюзе з сацыяль-фашыстымі рыхтуюцца да нападу на СССР. Чыгуначнікі заяўляюць, што яны ў выпадку нападу ворага выканаюць свой абавязак перад бацькаўшчынай. Семафоры на Захад адкрыты. Цягнікі —напагатове.

Чырвонаармейцы №-га артдыву паслалі на бальён свайго дэлегата т. Агуліна.

Дэлегат артдыву перадаў дэманстрантам, што байцы—артылерыстыя вучацца баявым традыцыям дывізіёну. Летняя вучоба дала добрыя вынікі. Гарматы і гаўбіцы прачышчаны, набіты і гатовы страляць па варагох.

Чырвоная армія, разам з усімі працоўнымі, бярэ актыўнейшы ўдзел у будаўніцтве сацыялізму. Разам з тым яна ні на хвіліну не забывае, што вораг точыць зубы на нашу краіну. Няхай ведаюць працоўныя, што Чырвоная армія—на пагатове.

Настаўнік т. Гальчук у сваёй прамове падкрэсьліў, што па прыродзе сваёй буржуазія ня можа абыйсьціся без вайны. Сама сыстэма капіталізму параджае вайну, толькі пры дыктатуры пралетарыяту будзе зьнішчана небясьпека вайны. Працоўныя СССР павінны ведаць, што дулы гармат капіталістых накіраваны супроць іх. Працоўныя павінны адказаць на падрыхтоўку імпэрыялістых згуртаваньнем сваіх радоў вакол кампартыі, клопатамі і дапамогай Чырвонай армії.

Е.

Мы не забылі баявых традыцый мінулага

МАЗЫР. (Наш кар.). Шматлюдны сход рабочых ф-кі «Чырвоны Кастрычнік» з напружанасьцю заслухаў даклад аб міжнародным чырвоным дні. У прынятай па дакладу рэзалюцыі рабочыя ганьбілі наглую вылазку кітайскіх мілітарыстых.

Рабочыя ўсе як адзін выказалі сваю гатоўнасьць у любую хвіліну кінуць сям'ю і працу і пайсьці кроўю абараняць сваю краіну.

Рабочыя заводу «Чырвоны Кастрычнік» у дні грамадзянскай вайны змагаліся в балахоўцамі і абаранялі фабрыку ад нападу ворага. Яны не забылі баявых традыцый мінулага.

У адказ на правакацыю імпэрыялістых мы пастанаўляем адпрацаваць дзень 11-га жніўня і фонд індустрыялізацыі.

1-га жніўня ў вёсцы Церахаўка, Гомельскай акругі

Голас 30.000

Віцебск (наш кар.). 30-ці тысячная дэманстрацыя працоўных Віцебску аднагалосна патрабавала рашучага адпору імпэрыялістам захватчыкам КУЧУ-гункі. На агульна гырадзкім мітынгу з прамовай выступіў прадстаўнік кітайскай сэкцыі Камінтэрну, які быў сустраканы бурнай авацыяй. Усе выступаўшыя прамоўцы спыняліся на неабходнасьці яшчэ лепшага умацаваньня абароны СССР, барацьбы в правакацыямі новых войн і узмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва СССР.

ПЕРШЫ СНОП—НА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ КРАІНЫ

(Церахаўка, Гомельскай акр.)

Міжнародны Чырвоны Дзень ў Церахаўцы прайшоў вельмі актыўна.

Да 11 гадзін раніцы на вакзальную плошчу пачалі зьбірацца арганізаваныя рабочыя і служачыя па саюзах.

З вёскі Вуці падыйшла партыйная і камсамольская арганізацыя ў саправоджаньні духавога аркестру шэфа—гомельскіх чыгуначнікаў. З вакольных вёсак зьявілася шмат сялянства.

Шмат прамоўцаў выказвалася за 100 процантную падпіску рабочых і служачых на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і за першы сялянскі сноп на індустрыялізацыі краіны. ЦІШКОЎ.

**

ВОРША. (Наш кар.). У дзень першага жніўня 14 тысяч рабочых і служачых гор. Воршы і Аршанскага чыгуначнага вузла, разам в чырвонаармейскімі часткамі і прыбыўшымі дэлегацыямі унегарадзкіх прадпрыемств і вакольнага працоўнага сялянства пад чырвонымі сьцягамі УсеКП(б) дэманстравалі сваю салідарнасьць з пралетарыятам і сялянствам капіталістычных краін, калёній і паўкалёній, запэўнілі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б—праводыра і кіраўніка рабочае клясы ў поўнай рашучасьці і гатоўнасьці напружыць усе сілы для ажыцьцяўленьня вялікіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, і барацьбы з сусьветным капіталам.

Сяляне Аршанскага р-ну чырвоным абозам прывезьлі першы сноп ураджаю ў фонд аб ароны краіны.

Узмоцнім калектывізацыю

Койданава (наш кар.). 1 жніўня адбыўся вялікі мітынг пратэсту супроць падрыхтоўкі міжнароднага капіталу да вайны. У мітынгу ўдзельнічала звыш 3000 чалавек.

У прынятай рэзалюцыі працоўныя Койданава абяцаюць у адказ на бандыцкі напад на СССР, яшчэ больш узьнаць прадукцыйнасьць працы, узмацніць калектывізацыю сельскай гаспадаркі і падпісацца на 3 пазыку індустрыялізацыю ў разьмеры 100 проц. месячнага заработку.

—Мы ўсе, як адзін,—гаворыцца ў рэзалюцыі,—у патрэбны момант выступім на абарону нашай савецкай дзяржавы, мы ў любую хвіліну гатовы замяніць плуг і молат на стрэльбу і кулямёт.

Гатовы замяніць плуг на вінтоўку

(Баеўскі сельсавет, Аршаншчына)

На мітынгу, прысьвечаным дню 1-га жніўня,—у вёсцы Баёўка, Лядзянскага раёну, сабралася 2 тысячы чалавек. Мітынг катэгарычна пратэставаў супроць наглага нападу на Кіт. Усх. ч.

— Працоўныя сяляне Баеўшчыны гатовы кожную хвіліну зьмяніць плуг на вінтоўку для абароны межаў СССР.

— Працоўныя Баеўшчыны вітаюць выпуск 3-й пазыкі індустрыялізацыі і абяцаюць падпісацца на пазыку з такім разьлікам, каб ніводная хата не засталася без аблігацый.

— Працоўнае сялянства ўступае ў сацыялістычнае спаборніцтва па ўзьняцьці сельскай гаспадаркі,—гаворыцца ў рэзалюцыі, прынятай на мітынгу.

ДЗЕСЯЦІТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ГОМЕЛІ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). З вялікім уздымам прайшоў міжнародны чырвоны дзень на акрузе. Працоўныя Гомельшчыны паказалі сваю поўную гатоўнасьць абараняць сацыялістычнае будаўніцтва.

Яшчэ напярэдадні 1-га жніўня на прадпрыемствах і ў вёсцы адбыліся мітынгі пратэсту супроць падрыхтоўкі да новай бойні. Пралетарыят гораду разам з працоўнай вёскай абяцалі поўнасьцю падтрымаць урад ва ўсіх яго мерапрыемствах.

У дзень 1-га жніўня зараз-жа пасьля працы пралетарыят Гомелю выйшоў на вуліцу. Стройныя калёны з плякатамі, якія выяўлялі баявую гатоўнасьць працоўных, прадэманстравалі свае давер'е да партыі і ўраду, гатоўнасьць выканаць пяцігодку.

Магутна гучэў голас прадстаўнікоў Чырвонай арміі, якія запэўнілі партыю і ўрад, што Чырвоная армія ўзмоцнена займаецца вучобай і пільна сачыць за намерамі буржуазіі.

Чырвоная армія па першаму заклику партыі і ўраду гатова на бой для абароны заваёў рэвалюцыі.

У дэманстрацыі прымала ўдзел 10 тысяч чалавек.

Пленумы гарсаветаў у Гомелі і ў Новабеліцы, разам з партактывам, прафактывам і вайсковымі часьцямі прынялі рэзалюцыю, у якой працоўныя патрабуюць аслабаненьня палітзьняволеных, якія знаходзяцца у кітайскіх турмах.

Работніцы ф-кі «Вэзуві» адказалі на наглую вылазку імпэрыялістых уступленьнем у рады кампартыі і заклікалі ўсіх рабочых цясьней згуртавацца вакол кампартыі.

Сялянскі мітынг пратэсту проці войны ў м. Смапявічы

Голас рабочай Ляхаўкі

Кожны дзень, а 4 гадз. увечары дераклікаюцца гудкі 2 чырвонштандартных заводаў: «Энэргія» і «Бальшавік». Гудкі абвяшчаюць канец працы. З брам абодвых заводаў высыпаюць на вуліцу сотні рабочых, зьбіраюцца ў групкі, каб нахіравацца дамоў, у горад ці бліжэйшы рабочы пасёлак.

1 жніўня гучней, чым звычайна крычалі заводзкія сірэны на Ляхаўцы. У пераклічку гудкоў «Энэргіі» і «Бальшавіка» ўмяшаўся гудок дражджавога заводу «Чырвоная Зара». Здавалася, гудкі імкнуліся перакрычаць адзін другога.

— Слухай, Ляхаўка! Сёньня—Міжнародны Чырвоны Дзень. Усе на дэманстрацыю...

На гарбарні «Бальшавік»—лятучы мітынг. На трыбуне т. Ашаровіч.

— Памятай пра вайну — пачынае прамоўца.

— Ці-ж можна забыць, —кажа стары рабочы,—мы ніколі не забудзем.

— Гарбары сумесна з чырвонаармейцамі свайго падшэфнага дывізіёну заявілі:

— Мы вайны ня хочам, але гатовы ў любы момант даць адпор буржуазіі. Мы заяўляем аб сваёй гатоўнасьці ажыцьцявіць 5-гадовы плян абяцаем пасьпяхова правесьці падпіску на 3-ю пазыку.

Гэта—ня гучныя словы. Чырвоштандартны «Бальшавік» даказаў на справе сваю адданасьць сацыялістычнаму будаўніцтву. На 1 жніўня падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі складае ўжо 61 тысячу р.

Мітынг скончаны. Пад гукі аркестраў гарбары доўгай калёнай выходзяць на вуліцу. Там іх чакаюць рабочыя «Энэргіі». Абедзьве калёны аб'ядноўваюцца ў адзін магутны атрад пралетараў.

— Хочаш міру, рыхтуйся да вайны.

— Няхай ведаюць імпэрыялістыя, што мы не развучыліся ўладаць зброяй.

— Мы гатовы замяніць варштаты на вінтоўкі.

З такімі лёзунгамі прыйшлі рабочыя Ляхаўкі на пляц Волі, да трыбуны, Рабочая Ляхаўка папярэджвае капіталістых і сацыял-фашыстых, што яна гатова да барацьбы.

С. Г.

Панская Польшча і баярская Румынія ўзбройваюцца пры падтрыманьні міжнароднага імпэрыялізму супроць СССР. Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба працоўных Польшчы і Румыніі супроць імпэрыялістых!

Напружаным тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва—зробім непераможнай савецкую краіну ў барацьбе з імпэрыялістымі. На рашучую барацьбу з сусьветным капіталам, за перамогу сацыялізму!

НЯ МЕНШ МЕСЯЧНАГА ЗАРАБОТКУ--у 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

ПАСЬПЯХОВАЕ РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ ПАЗЫКІ---ЗАЛОГ РОСТУ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ СССР

Хэмічная прамысловасьць і асеньняя пасеўная кампанія

Да самага апошняга часу пытаньне аб ужываньні хэмічных сродкаў у сельскай гаспадарцы было ў загоне. Досыць напомніць, што яшчэ ў мінулым годзе мы маглі знайсьці такі справачнік агранома, дзе паказвалася, што азотныя і калійныя ўгнаеньні даюць мала карысьці. Між тым, гэта якраз тыя ўгнаеньні, якія набываюць усё большае і большае значэньне ва ўсім сьвеце. Паводле разьлікаў розных навуковых інстытутаў за апошнія 50 год 50 проц. усяго павышэньня ўраджайнасьці ў Эўропе ідзе за кошт ужываньня мінэральных ўгнаеньняў. Папершае, ужываць сродкі барацьбы са шкодзікамі на маленькіх вучастках зусім немагчыма, бо гэта зусім дарэмна. Падругое,—няправільна, што з аднолькавым посьпехам пры нашай ступені культурнасьці можна ўжываць хэмічныя сродкі як у звычайных індывідуальных сялянскіх гаспадарках, так і ў культурных с.-г. адзінках, якімі вызьўляюцца калгасы і саўгасы. Вязымоўна, што пры правільным ужываньні ўгнаеньня, пры наглядзе за вынікамі камбінацый угнаеньняў, пры правільнай клясавай палітыцы разьмеркаваньне ўгнаеньняў, якіх не хапае, ужываньне іх на сацыялістычным сэктары і адсюль значнае павышэньне ўраджайнасьці гэтага сэктару параўнальна з іншымі будзе служыць надзвычайна магутным спосабам умацаваньня сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. Значыць, дасягненьні ва ўжываньні ўгнаеньняў у сацыялістычным сэктары будуць спрыяць рэканструкцыі, будуць зьяўляцца імпульсам рэканструкцыі ўсёй іншай часткі сельскае гаспадаркі і будуць спрыяць пераходу на калектыўныя формы...

Улічваючы вялікае значэньне ўжываньня хэмічных угнаеньняў у сельскай гаспадарцы Саюзу, пяцігодка прадугледжвае надзвычайна шпаркі рост разьвіцця гэтай галіны вытворчасьці. Калі ў бягучым годзе мы ўжывалі 350.000 тон розных відаў угнаеньняў, то паводле пяцігодкі намечана 8,5 мільёнаў тон.

Ужо зараз ёсьць значны рост ужываньня ўгнаеньняў. У часе веснавой пасеўнай кампаніі 1929 г. забесьпячэньне сельскае гаспадаркі супэрфасфатам павялічылася параўнальна з 1928 годам на 67 проц., фасфарытнай мукой—на 200 проц. і сульфатам—на 37 проц.

Для асеньняй кампаніі супэрфасфату будзе дана на 37 проц. больш, фасфарытнай мукі—на 300 проц. і сульфату амонія—на 150 проц. больш, чым у адпаведны пэрыяд мінулага году.

Але гэтыя лічбы яўна невыстарчальныя ня толькі параўнальна з патрэбамі, але і ня зусім выстарчальны для выкананьня ўрадавага заданьня.

Побач з недахватам угнаеньняў, мы маем ня зусім правільнае ўжываньне іх. Практыка некаторых выбарачных абсьледваньняў, зробленая па мінулагодняй веснавой і асеньняй пасеўных кампаніях, паказвае, што насельніцтва невыстарчальна інфармавана аб парадках ужываньня угнаеньняў, а тэхніка забесьпячэньня далёка нездавальняючая. Такое становішча, бязумоўна, паслабляе эфэктыўнасьць ужываньня угнаеньняў.

Выбарачнае абсьледваньне паказала, што ўрадавая дырэктыва аб ужываньні ільготных крэдытаў для бядняцкіх плацтоў і водпуск угнаеньня паводле клясавага прынцыпу далёка ня ўсюды выконваецца. Таму, у часе сёлетняй асеньняй кампаніі грамадзкія і ўрадавыя арганізацыі павінны завастрыць сваю ўвагу ня толькі на тэхнічным інструктаваньні ўжываньня ўгнаеньняў, але і на правядзеньні правільнай клясавай палітыкі ў справе забесьпячэньня насельніцтва ўгнаеньнямі.

Трэба сказаць, што аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі, нашы калгасы і саўгасы, да гэтага маюць мала непасрэднай сувязі з хэмічнай прамысловасьцю, а гэта адмоўна адбіваецца як на забесьпячэньні, так і на абмене практыкай паміж хэмічнай прамысловасьцю і органамі сельскае гаспадаркі. У часе пасеўнай кампаніі трэба ўстанавіць больш цесную сувязь калгасаў і саўгасаў з хэмічнай прамысловасьцю і з навукова-дасьледчымі органамі па ўжываньні хэмікалій у сельскай гаспадарцы. Сувязь гэта павінна ісьці як па лініі прамысловасьці, так і па лініі органаў НКЗему.

Нялішнім будзе напомніць, што паводле вылічэньняў спэцыялістых, страты народнае гаспадаркі ад розных відаў шкодзікаў расьлін перавышаюць два мільярды рублёў у год. Між тым, ужываньне хэмічных сродкаў барацьбы са шкодзікамі, яўна невыстарчальнае.

У надыходзячую асеньнюю кампанію забесьпячэньне сельскае гаспадаркі сродкамі барацьбы са шкодзікамі значна ўзрастае. Так, меднага купаросу накіроўваецца ў сельскую гаспадарку да надыходзячай асеньняй кампаніі ў 4 з палов. разы больш, чым летась, жалезнага купаросу—у пяць раз больш леташняга. Акрамя таго, сельская гаспадарка будзе, у нязначнай праўда ступені, забясьпечана наступнымі новымі відамі барацьбы са шкодзікамі: аднаводным медным купаросам, вуглякіслай медзьдзю малахітам і хромпікам.

Гэтыя сродкі барацьбы са шкодзікамі здабыты на месцы—у Савецкім Саюзе, і яны пазбаўляюць нашу краіну ад завозу з-за мяжы дарагіх хэмікалій.

У гэтую асеньнюю кампанію пытаньне правільнай арганізацыі ўжываньня і забесьпячэньня сродкамі барацьбы са шкодзікамі і мінэральнымі ўгнаеньнямі павінна выклікаць самую пільную ўвагу савецкай грамадзкасьці. Гэта справа павінна паслужыць умацаваньню вытворчай змычкі паміж горадам і вёскай.

Н. Г.

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на заводзе імя „Домбаля"

Хроніка падпіскі

Калектыў супрацоўнікаў Мазырскага Аддзяленьня Дзяржбанку падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 120 проц. месячнага заработку. Агульная сума падпіскі—1805 рублёў. З мэтай найбольш хуткага збору сродкаў на оправу індустрыялізацыі, супрацаўнікі Мазырскага аддзяленьня дзяржбанку сабралі і ўнесьлі, як першы ўзнос па выплаце пазыкі, 72 рублі.

**

Загадчык Чэрвеньскага працкалектыву абутнікаў тав. Карой Тарасо падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі ў разьмеры 300 проц. месячнага заработку і выклікае зрабіць тое самае т. т. Пілляра (упа Унаважаны ДПУ), Кроля (нач. міліцыі), Яворскага (нач. акр. аб'ядн. працкалектываў), Жука (пам. нач. акр. аб'ядн. п-к.) і Буткевіча (старш. чэрвеньскага РВК).

**

Рабочыя і служачыя кахельнага заводу «Пралетары» (Копысь) падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на суму 29.000 рублёў. Шмат таварышоў падпісаліся на 150 проц. месячнага заработку.

**

Працаўнікі сувязі Смалявіцкага раёну падпісаліся на пазыку на суму 750 руб., што складае 150 проц. месячнага акладу пэнсіі.

**

Рабочыя саўгасу «Габрыэлева» падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на суму 1285 рублёў. Шмат рабочых падпісалася на 200 проц. месячнага заработку.

Трэба адзначыць, што камсамольская ячэйка саўгасу зусім ня прымае ўдзелу ў правядзеньні падпіскі на пазыку. Рад камсамольцаў (Крэмез, Піліпчык, Катлінскі) самі яшчэ не падпісаліся.

— У адказ на правакацыі і спробы выклікаць нас на вайну, мы ўзмацняем сацыялістычнае будаўніцтва, здаем дачасна падатак. Няхай шалее буржуазія,—заяўляе сялянства Мазыршчыны.

— Атрымаўшы акладныя лісты па падатку, гаспадары вёскі Брынёва. Петрыкаўскага раёну, здалі да тэрміну 955 рублёў падатку.

— Сяляне Тураўскаа раёну да тэрміну ўнесьлі 1 тысячу 400 рублёў.

— На другі дзень, пасьля атрыманьня лістоў сялянства Жыткавіцкага раёну з вёскі Бялева ў ліку 11 чалавек ўнесьлі 29 процантаў усяго налічанага падатку.

— Гэта адзін адказ,—кажуць сяляне, а другі, калі будзе патрэбна, мы дамо паном з вінтоўкаю ў руках.

Менскія транспартнікі далі 36.000 рублёў

Менскія транспартнікі падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 36.000 руб., што складае 95 процантаў месячнага фонду зарплаты.

Ёсьць паасобныя таварышы, якія падпісаліся на 300-400 проц. заработнай платы.

Б. А.

Падпіскай ахоплены ўсе прадпрыемствы

БАРЫСАЎ (наш кар.) Падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі ахоплены амаль што усе прадпрыемствы. Ня гледзячы на тое, што завод імя Домбаля спыніўся на рамонт, падпіска на ім ужо пачалася. Падпісаўся на пазыку 151 чалавек на суму 12 т. рублёў. Сярод іх некалькі рабочых, аддаўшых на пазыку 200 проц. зарплаты.

Рабочы Дубовіч Аркадзі, які зарабляе ў месяц 50 руб., падпісаўся на 200 руб.

Мінімум 100 проц. зарплаты

МАЗЫР. (Наш кар.). За 2 — 3 дні падпіска на чырвонаштандартнай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» дала каля 4.000 р.

Некаторыя рабочыя падпісаліся на 200—250 проц. зарплаты: рабочы Арголін які атрымлівае 50 р. пэнсіі, падпісаўся на 130 р., рабочы Хазанаў Ф., атрымлівае 70 р., а падпісаўся на 250 р., рабочы Турэцкі Г., атрымлівае 80 р., падпісаўся на 200 р.. Мінімум падпіскі—месячная зарплата

Падпіска на гарбарнях

Падпіска на гарбарнях Белскуртрэсту дала 130 тысяч рублёў. На першым месцы ідзе працкалектыў рымароў, дзе падпіска значна перавысіла фонд месячнай зарплаты.

За адзін дзень--3100 руб.

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). На калектывае АВК за адзін дзень супрацаўнікі падпісаліся на 3100 руб. Мяркуецца сабраць 7000 руб.

Камісія па садзейнічаньні дзяржкрэдыту АВК разгарнула шырокую работу.

Піянэрскі нядзельнік — на карысьць пазыкі

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў даць работу на менскіх прадпрыемствах ў адзін з дзён паміж 1-5 жніўня, 500 піянэрам. Грошы з нядзельніка будуць выданы піянэрам на калектыўную падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Мітынг пратэсту ў лягэрах

(«ЧЫРВОНАЕ ВУРОЧЫШЧА»)

1-га жніўня адбыўся масавы мітынг-пратэсту чырвонаармейцаў у лягэрах, прысьвечаны Міжнароднаму Чырвонаму Дню.

На мітынг да чырвонаармейцаў прыехалі прадстаўнікі Камінтэрну і амэрыканскай кампартыі Вісэй і Іофэ, палітэмігрант Заходняй Беларусі Карповіч і дэлегацыя шэфаў рабочых-чыгуначнікаў і рабкораў Маскоўска-Курскай чыг.

Зусім невышадкова, чаму гэты мітынг такі масавы і чаму такая зацікаўленасьць чырвонаармейцаў да дакладу свайго камандзіра дывізіі тав. Лакціёнава аб МЧД, бо Рабоча-сялянская Чырвоная армія вызьўляецца магутнай апорай рабочае клясы ўсяго сьвету, і ў гэты дзень дэманстрацыі пралетарскай салідарнасьці, клясавы энтузіязм і бадзёрасьць у чырвонаармейцаў асабліва адчуваецца.

Тав. Лакціёнаў у сваім дакладзе фактамі выкрывае балбатню Лігі Нацый аб разбраеньні, і што ў той-жа час, як ніколі, імпэрыялістыя рыхтуюцца да новай крывавай бойні. Усякімі правакацыямі буржуазія стараецца ўцягнуць СССР у вайну, бо буржуазія ўсяго сьвету адчувае набліжэньне пагібелі, блізкую здань пралетарскай рэвалюцыі.

У сваёй гарачай прамове прадстаўнік шматмільённага прыгнечанага народу—неграў т. Вісэй на ангельскай мове выкрывае здрадніцтва жоўтых прафсаюзаў Амэрыкі, якія ня толькі не абараняюць інтарэсы рабочых-неграў, але нават ня прымаюць іх у прафсаюз. Нэгры ў Амэрыцы зьвяўляюцца «лишенцами», па прыкладу царскай Расіі, дзе яўрэі ня мелі ніякіх праў. Амэрыка ўзброена да зубоў. Нядаўна было асыгнавана 20 мільёнаў даляраў на пабудову больш магутнага флёту ў Амэрыцы. У гэтым працоўныя Амэрыкі бачаць падрыхтоўку да новай вайны. Але кампартыя Амэрыкі на варце. Яна згуртавала вакол сябе ўсіх прыгнечаных народаў Амэрыкі. Асабліва вялікая работа праводзіцца сярод нэграў.

Апошнія словы т. Вісэя «Няхай жыве наша Чырвоная армія!, «Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Амэрыцы!» падхапляюць чырвонаармейцы гучнымі воплескамі і крыкамі «ура».

Яго прамову перакладае на расійскую мову другі прадстаўнік амэрыканскай кампартыі т. Іофэ і з свайго боку вітае чырвонаармейцаў ад кампартыі і працоўных Амэрыкі.

Палітэмігрант Карповіч гаворыць аб эканамічным становішчы працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы, аб дрэнным становішчы палітзьняволеных у Лукішках, у Вільні, дзе ён прасядзеў 3 гады.

З прывітаньнем ад 40.000 рабочых і служачых Маскоўска-Курскай чыгункі, 6.000 рабкораў-чыгуначнікаў і газэты «Гудок» выступае т. Ісаеў, які гаворыць, што, калі чыгуначнікі ў адказ на ноту Керзана пабудавалі на свае грошы 32 самалёты, то ў адказ на захват К.-Усх. чыг. усе чыгуначнікі гатовы ў любы момант зьмяніць свае варштаты на зброю і разам з Чырвонай арміяй кінуцца ў бойку за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Адзін за другім выступаюць чырвонаармейцы. Усе яны заяўляюць, што спаборніцтва, якое праводзіцца зараз у лягэрах паміж чырвонаармейцамі, даказвае, што Чырвоная армія баяздольная і гатова, як ніколі, па першым заклику выступіць на абарону савецкай улады і сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Лес рук чырвонаармейцаў узьнімаецца за рэзалюцыю пратэсту, у якой гаворыцца: «Проч падпальшчыкаў новай вайны!», «Прэч фашыстых — катаў рабочае клясы», мы, чырвонаармецы заяўляем, што ня ўдасца імпэрыялістым справакаваць савецкую ўладу на вайну, бо мы пільна сочым і гатовы даць адпор усякім правакацыям. Няхай жыве сусьветны Кастрычнік! Шлем гарачае чырвонаармейскае прывітаньне ўсім працоўным Амэрыкі, Заходняй Беларусі і Польшчы! У асобе т. Вісэя мы вітаем усіх прыгнечаных неграў у іх барацьбе за вызваленьне ад буржуазнага ўціску.

ЦУДЗІН.

Наш адказ

На пленуме Нова-Беліцкага райсавету

Пленум райсавету ўстае для прыняцьця рапартоў вайсковых часьцей.

Затым—даклад тав. Рычкова аб значэньні дня 1-га жніўня. Даклад перарываецца паведамленьнем прэзыдыуму: «Прыбыў прадстаўнік кітайскіх працоўных тав. Бо-Жа-у». Бура воплескаў рвецца на сустрэч яму. На ламаной расійскай мове т. Бо-Жа-у расказвае:

«За сусьветную рэвалюцыю «ура», «Мы таксама гатовы. Першага жніўня мы выйдзем з пратэстам супроць правакацыі вайны».

—канчае Бо-Жа-у. Гэта «ура» перарастае ў бурную авацыю, як быццам, праз сьцены клюбу хоча праравацца туды, да мільёнаў жоўтатварых кітайскіх кулі.

Ад рабочых—адказвае тав. Пажарнікаў.

«Пралетары сьвету—гэта вялікая сіла—гаворыць ён. Яны захочуць, і спыняцца заводы і электрастанцыі, замруць чыгункі і трамваі... Яны захочуць, і перавернуць сьвет. Яны гатовы сказаць кучды бандытаў: «Рукі прэч ад СССР, штабу сусьветнай рэвалюцыі»,—і яны гэта скажуць.

Тав. Міткевіч, чырвонаармеец, расказвае, што казармы кіпелі і рваліся ў бой, калі прышлі першыя тэлеграмы з Кітаю. «Даеш на мяжу»,—вось лёзунг усіх байцоў у гэтыя дні.

Толькі хуткае разьвіцьцё індустрыялізацыі забясьпечвае селяніну машыны, угнаеньні і добры тавар. Ніводнай сялянскай хаты—без аблігацыі 3-яй пазыкі індустрыялізацыі!

Да піянэрскага зьлёту

Падрыхтоўка ў рэёне

Рабочыя даюць прытулак піянэрам

60 рабочых заводу «Бальшавік» падалі заявы аб тым, што ны хочуць узяць на кватэры да сябе піянэраў, якія прыедуць на Усебеларускі зьлёт піянэраў.

Факельная дэманстрацыя піянэраў

Скончыўся раённы зьлёт піянэраў Крупскай арганізацыі, у якім удзельнічалі 130 дэлегатаў.

Удзельнікі зьлёту абмеркавалі даклад райбюро. У рабоце зьлёту прынялі актыўны ўдзел мясцовыя партыйныя і прафэсіянальныя арганізацыі і камсамольскія ячэйкі. Супольна з піянэрамі ваколічных вёсак і неарганізаванымі дзецьмі дэлегаты правялі вялікую факельную дэманстрацыю пратэсту супроць бандыцкага налёту на Кітайска-Усходнюю чыгунку. У дэманстрацыі удзельнічала звыш 600 неарганізаваных дзяцей і 500 дарослых. Удзельнікі зьлёту абралі дэлегацыю на Усебеларускі зьлёт. Арганізаваны новы атрад з 67 дзяцей рабочых і вясковай беднаты.

Да прыёму ў ВНУ і тэхнікумы

Новыя тэрміны падачы заяў

Як мы ўжо пісалі, у гэтым годзе было падана ў ВНУ і тэхнікумы вельмі мала заяў. Каб лепш укамплектаваць ВНУ, Наркамасьветы ўстанавіў новыя тэрміны падачы заяў.

Прыём заяў у Менскі і Віцебскі політэхнікумы, фармацэўтычны і акушорскі тэхнікум у Магілеве, садова-агародны тэхнікум, працягнуты да 5 жніўня. Прыём у гэтыя тэхнікумы павінен быць скончаны да 15 жніўня.

Прыём ва ўсе іншыя тэхнікумы адтэрмінаваны да 20 жніўня. Вынікі залічэньня—1 верасьня.

Прыём заяў у ВНУ адтэрмінаваны да 25 жніўня, прыём і залічэньне робіцца таміж 25 жніўня і 5 верасьня.

У тых тэхнікумах, дзе ёсьць некалькі аддзяленьняў, дырэктары могуць са згоды паступаючых залічыць вытрымаўшых іспыты на розныя аддзяленьні, а ня толькі на тыя, што паказаны ў заявах.

ПРЫЁМ У ВЯЧЭРНІ РАБОЧЫ УНІВЭРСЫТ,Т

Сёлета ў вячэрнім рабочым унівэрсытэце ўведзены вольны прыём, прычым, асобы, якія будуць мець камандзіроўкі ад прафсаюзаў, прымаюцца ў першую чаргу. Культаддзелу ЦСПСД пастаўлена задача паслаць у вячэрні рабочы унівэрсытэт рабочых, якія намечаны да вылучэньня па прафэсіянальнай, савецкай і гаспадарчай лініі.

СЁМЫ ВЫПУСК

З году ў год на працягу 7-мі гадоў школа каманднага складу міліцыі імя Фрунзэ выпускае кваліфікаваных работнікаў. Рады міліцыі БССР з году ў год папаўняюцца новымі кадрамі працаўнікоў, якія падкавалі сябе тэарытычна.

Сёньня выходзіць з школы 72 курсанты, што прайшлі гадовы курс навучаньня.

Многія з выпускнікоў пры залічэньні іх у школу год таму назад ня ведалі самых элемэнтарных правіл, амаль не разьбіраліся нават у простых ліках.

Шмат прышлося папрацаваць каманднаму і настаўніцкаму складу школы, каб за такі параўнаўча кароткі тэрмін—на працягу няпоўнага году дабіцца належных посьпехаў. Гэтаму спрыяла сьвядомасьць самых курсантаў, якія, ня гледзячы на рад труднасьцяй: недахват пасобнікаў і падручнікаў, цесната памяшканьняў, празьмерная нагрузка,—зрабілі ўсё магчымае, каб атрымаць належную падрыхтоўку.

Аб вялікіх посьпехах курсантаў сьведчаць характарыстыкі савецкіх, партыйных і грамадзкіх арганізацый, атрыманыя курсантамі на вёсцы за час месячнай практычнай працы там.

Наша пажаданьне т. т. выпускніком—не замыкацца ў міліцэйскай шкарлупе, а быць грамадзкімі работнікамі, цьвёрдымі, вытрыманымі, сьвядомымі і выстарчальна чулымі абаронцамі рэвалюцыйнай законасьці.

В. БАЛЬЗОЎСКІ.

«СПОРТ»

Перад усебеларускай спартакіядай фізкультурнікаў

Усебеларуская спартакіяда вясковых фізкультурнікаў — адкрываецца 17-га жніўня. Урачыстае пасяджэньне адбудзецца ў доме «Культуры».

18-га жніўня зранку адбудзецца парад-дэманстрацыя ўдзельнікаў спартакіяды і фізкультурнікаў Менску, у якой прыме ўдзел да 2.500 фізкультурнікаў.

Увечары, 18-га жніўня, пачнуцца спаборніцтвы каманд. Спаборніцтвы будуць праведзены па лёгкай атлётыцы для мужчын і жанчын, па гульнях і плаваньні.

Ужо ўкамплектаваны поўнасьцю судзейскі апарат.

Спаборніцтвы будуць праводзіцца на спортпляцоўцы саду «Прафінтэрн», у самым садзе і ў лятэрах.

Уваход на спаборніцтва дармовы, па білетах, якія будуць разьмеркаваны ВСФК па прадпрыемствах і ва ўстановах.

Для ўдзельнікаў спартакіялы будзе арганізаваны рад экскурсій у музэі, на прадпрыемства і г. д.

Усе калектывы, якія прымаюць удзел у спартакіяде, атрымаюць падарункі ад ЦВК БССР, ЦК ЛКСМБ, ЦП Рабземлес, ВСФК, таварыства «Дынама» і г. д.

Як праходзіць вэлёпрабег

Усебеларускі зорны вэлёпрабег праходзіць з вялікім посьпехам. Ужо выйшлі каманды з усіх округ. Па вестках, якія маюцца ў ВСФК, большасьць удзельнікаў прабегу—рабочыя з фабрык і заводаў. У дарозе ўдзельнікі прабегу праводзяць гутаркі з сялянамі аб міжнародным Чырвоным Дні, пазыцы індустрыялізацыі і сялянскай спартакіядзе.

ВСФК арганізуе ў нядзелю, 4 жніўня, ўрачыстае спатканьне ўсіх каманд, якія а 12 гадзіне павінны прыбыць на пляц Волі, дзе адбудзецца мітынг. У панядзелак арганізуецца сход усіх удзельнікаў прабегу.

Сёньня пачынаецца чыстка апарату Камунбанку

Камісія на чыстцы Камунбанку паведамляе, што агляд работы і чыстка апарату Камунбанку пачынаецца сёньня, 3-га жніўня, у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых (рог вуліц Энгельса і Камуністычнай), а 6 гадз. увечары.

Камісія зьвяртаецца з просьбай да будаўнічых рабочых, да працаўнікоў камунальнай гаспадаркі і жыльлёвага будаўніцтва, ЖАКТ'аў і інш. кліентаў банку, а таксама да рабочых дрожджававоду «Чырвоная Зара», прадстаўнікі якога прымалі непасрэдны ўдзел у праверцы асабістага складу працаўнікоў банку, прыняць удзел у рабоце камісіі па аглядзе і чыстцы апарату банку.

Камісія па чыстцы.

Менск

У гарсавеце

Як працуе сэкцыя аховы здароўя

Прэзыдыум гарсавету заслухаў даклад сэкцыі аховы здароўя аб рабоце сэкцыі за апошнія тры месяцы. Прызнана, што сэкцыя дасьледавала рад лекавых устаноў, прапрацаваны кантрольныя лічбы па лініі аховы здароўя на 1929-30 г. і г. д. Сэкцыя праводзіць сваю працу галоўным чынам на прадпрыемствах.

Пашырэньне тэрыторыі заводу „Энэргія"

Прэзыдыум гарсавету пастанавіў пашырыць тэрыторыю заводу «Энэргія». Да тэрыторыі заводу далучаецца двор, які зараз займае школа фабзавучу гарбарні «Бальшавік».

1.000 дадаткаў да наказу

Прэзыдыум гарсавету закончыў разгляд дадаткаў да наказу, прапанаваных выбаршчыкамі ў часе перавыбараў гарсавету рабочымі. Налічваецца звыш 1.000 дадаткаў. Яны будуць канчаткова зацьверджаны на бліжэйшым пленуме гарсавету. Пры сэкцыі РСІ будзе арганізавана камісія для кантролю за выкананьнем наказу і дадаткаў да яго. Дадаткі будуць надрукаваны і распаўсюджаны сярод выбаршчыкаў.

Камісіі па адлучэньні царквы ад дзяржавы даручана безадкладна апрацаваць дадаткі да наказу рабочых, якія патрабуюць закрыць малітвеныя дамы.

Шаша Менск-лягэры

Прэзыдыум гарсавету зацьвердзіў праект пабудовы шашы Менск-лягеры.

Камгасу даручана тэрмінова прыступіць да земляных работ. Нагляд за пабудовай шашы даручаны Белдортраносу.

На будаўніцтве трамваю

Каменшчык б'е жарству

КІНО

„Джальма"

(Кіно-сад «Чырвоная Зорка»)

Фільм павінен быў паказаць клясавую барацьбу ў нашай вёсцы. З аднаго боку кулакі і царкоўнікі, а з другога—дэмабілізаваны чырвонаармеец, які прыехаў з Чачны разам з жонкаю чачэнкаю, які імкнецца аб'яднаць усе лепшыя элэменты вёскі.

Як-жа паказана ў фільме барацьба двух сіл вёскі?

Вядняцкая частка—неарганізавана, бяз усякага кіраўніцтва, на чале яе стаіць п'яніца-падкулачнік—старшыня сельсавету. Супроць яе выступае арганізаваная кулацкая банда, на чале з папом, які чытае «Правду».

Чаму гэта прыйшло ў галаву рэжысэра паказаць на экране мэнавіта такую вёску, вёску нікудышную і хворую? Ці нельга было паказаць сапраўдную вёску, такую вёску, якіх у нашым Саюзе пераважная большасьць, у якой клясавая барацьба вядзецца пад кіраўніцтвам ячэйкі, дзе арганізаваны не кулакі і царкоўнікі, а бядняцкія і серадняцкія масы?

На працягу ўсёй карціны мы ня бачым і намёку на партыйную ці камсамольскую ячэйку. А вёска немаленькая, аб гэтым гавораць аграмадныя натоўпы народу, на яе вуліцах.

Праўда, пад канец перамагае бядняцкая частка вёскі пад кіраўніцтвам чырвонаармейца, але гэта ўсё-ж ня выходзіць шчыра, бо ня можа адзін чалавек у кароткі час, без дапамогі партыйнай ці камсамольскай ячэйкі, перавярнуць усю вёску.

З боку мастацкага фільм выкананы даволі добра. Гульня артыстых натуральная і шчырая. Таксама добра падабраны тыпаж. Не адстае і апэратарская апрацоўка карціны.

Фільм—вытворчасьці ВУФКУ.

Навіны кіно

КУРСЫ КІНО-МЭХАНІКАЎ

У гэтым годзе пры Віцебскім політэхнікуме і Гомельскай школе мэталістых адкрываюцца аднагадовыя курсы кіномэханікаў на 100 чалавек, (па 50 чалавек у кожным горадзе). Слухачом курсаў будзе давацца стыпэндыя ў 40 р.

ПРЫЕЗД КІНО-ЭКСПЭДЫЦЫІ

Гэтымі днямі ў Менск прыяжджае рэжысэрская група фабрыкі Белдзяржкіно, на чале з рэжысэрам Лёшыным. Група працуе над камэдыяй «Хамэльён», якая малюе няўдалыя спробы выступіць пад маскай культурнага шэфа над вёскай.

У МЕНСКУ АДКРЫВАЕЦЦА «МЮЗІК-ХОЛ»

ПП саюзу працаўнікоў мастацтва пастанавіла адкрыць у памяшканьні цырку новае кіно «Мюзік-хол» Перад Белдзяржкіно ўзьнята пытаньне аб забесьпячэньні кіно новымі фільмамі.

У новым кіно будуць выступленьні артыстых эстрады пасьля сэансаў.

ЗДЫМКІ КАРЦІНЫ «ВОЛАТ»

У нядзелю, 4-га жніўня, у Ждановічах, Белдзяржкіно будзе граводзіць масавую кіно-здымку на карціне «Волат». У здымцы прыме ўдзел звыш 500 чалавек, акрамя вайсковых часьцей.

РАДЫЁ-КАНЦЭРТЫ Ў ЧАСЕ АБЕДЗЕНАГА ПЕРАПЫНКУ

Менская радыё-станцыя зрабіла захады да палепшаньня музычна-вакальнай часткі праграмы перадач. Значна пашыраецца праграма даённых і вячэрніх радыё-перадач. Уводзіцца штодзённая перадача канцэртаў у часе абедзеных перапынкаў.

УКРАІНСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА Ў МЕНСКУ

Т-ва прыхільнікаў выяўленчага мастацтва гэтай восьнью арганізуе ў Менску выстаўку украінскага мастацтва і скульптуры. Вядуцца перагаворы з Галоўмастацтвам УССР і аб'яднаньнем украінскіх мастакоў аб высылцы экспанатаў для выстаўкі.

Навіны тэхнікі

НА АВІЯЭТЦЫ Ў ДАЛЁКІ БЕСПАСАДАЧНЫ ПЕРАЛЁТ



На цэнтральным маскоўскім аэродроме скончыліся лётныя выпрабаваньні новага двухмясцовага лёгкага самалёту (авіяэткі), пабудаванага па праекту самага маладога авія-канструктара ў СССР, слухача Ваенна-Паветранай Акадэміі тав. А. Якаўлева.

Выпрабаваньні авіяэткі, праведзеныя слухачом акадэміі, лётнікам, т. Філіным, выкрылі добрыя лётныя якасьці машыны і вельмі ўстойлівае і добрае кіраўніцтва ёю. Асаблівасьцю авіяэткі зьяўляецца вялікая грузападзёмнасьць (яна падымае груз, роўны ўласнай вазе) і можа пратрымацца ў паветры 14 гадзін без пасадкі з двума лётнікамі, пакрыць за гэты час 1.700 клм.

У першых чыслах жніўня авіяэтка будзе адпраўлена ў вялікі беспасадачны пералёт, маршрут якога цяпер выпрацоўваецца. На адымку авіяэтка т. Якаўлева.

Кошт паветраных зносін у Амэрыцы

Па апублікаваных нядаўна ў Нью-Ёрку даных сярэдні кошт паветраных зносін у Амэрыцы складае 11 цэнтаў (каля 22 кап.) за мілю, каля 7 цэнтаў (14 кап.) за клм. Гэта сума ўключае кошт дастаўкі пасажыра з цэнтру гораду на аэрадром і назад.

Электрычны плуг

Амэрыканцы робяць досьледы з электрычным плугам, які на тольні разрыхляе зямлю, але адначасова ўгнойвае яе і забівае нагодную траву высокавольтным токам. Плуг прыводзіцца ў рух трактарам. Гэты-ж трактар прыводзіць у рух разьмешчаны на раме плуга генэратара току нізкага напружаньня, які тут жа трансфармуецца ў ток напружаньнем да 160.000 вольт. Ток прапускаецца праз два паралельныя адвалы, дзякуючы чаму паласа зямлі паміж двума адваламі наэлектрызавана. Ток забівае ўсе дзікія травы іх насеньне, якое трапляе ў шчыліну паміж адваламі

АЎТАБУСНЫ РЭЙС ПРАЗ ПУСТЫНЮ КАРА-КУМ

Па прыкладу Францыі, якая арганізавала аўтамабільныя зносіны ў пустыні Сахара, у нас зроблена спроба арганізацыі аўтамабільных зносін падобна транссахарскім у пустыні Кара-Кум, якая цягнецца на сотні кілёмэтраў на поўнач ад нізоўеў ракі Сыр-Дар'і, у межах Сыр-Дар'інскай і Тургайскай краін.

Пасьля некалькіх пробных пераездаў на спэцыяльна выпісаных шасьціколавых машынах «Рэно», устанаўленьня найвыгаднейшага маршруту, арганізацыі баз і г. д., удалося наладзіць нядаўна ў пяскох пустыні Кара-Кум з дапамогаю такіх машын напралёт рэгулярныя аўтамабільныя рэйсы, скарыстоўваючы іх як у навуковых, так і ў эканамічных адносінах.



Ангельскі лётчык Сьміт праляцеў без пасадкі 3.300 клм. паміж Сіднеем (Аўстралія) і Лёнданам.

Барацьба з саранчой у Паўночнай Афрыцы

У Алжыры (Паўночная Афрыка) у гэтым годзе нябывалы налёт саранчы. Мясцовыя ўлады арганізуюць шырокую барацьбу з саранчою. Для гэтай барацьбы ўжываюцца два галоўныя мэтады — атрута і агонь. Саранчу атручваюць раскідваючы па полі сыроп і іншыя спа, мыўныя матэрыі, прапітаныя мышьяковым натрыем. Добрыя вынікі дае загон саранчы ў ямы або спецыяльныя, агароджаныя ліставым жалезам месцы, дзе яе аблліваюць газай паляць. На барацьбу з саранчой асыгнавана 5 мільёнаў рублёў.

„ЗЬВЯЗДА" ДАПАМАГЛА

Іёселеў з працы юрысконсульта зьняты

Па заметцы надрукаванай у газэце «Зьвязда», пад загалоўкам «Яшчэ пра зьдзекі з тав. Харыка», Мен. АКК ўстанавіла, што **Рыўкінд** сапраўды сам атрымаў выканаўчы ліст і перадаў яго судыканаўцы свайго вучастку на заняцьце ў адным з жактаўскіх дамоў кватэры Харыка, які ў гэты час быў у службовай камандыроўцы, за што **Рыўкінду пастаўлена на від. Юрысконсульт БЖС--Іёселеў** дапусьціў **незаконнае дзеяньне** перадачай **Рыўкінду** выканаўчага ліста, чаго ён рабіць ня меў права, за гэта **Іёселеў з працы юрысконсульта зьняты.**

Лясьніцтва ачышчана ад чужых элемэнтаў

У № 162 газ. «Зьвязда» у 1928 г. быў надрукаваны допіс «Каралі лясоў», дзе пісалася, што ў Чарнянскім лясьніцтве, Барысаўскага раёну знайшлі сабе цёплае месца былыя людзі: лясьнічы **Жыхаревіч**—царскі служка і аб'езчык **Бурка**—былы царскі кат у Пяцярбурзе і г. д.

Пасьля рэвізіі інспэктарытам лясоў, усе гэтыя факты пацьвердзіліся. Лясьнічы **Жыхаревіч і аб'езчык Бурка зьняты з працы.**

Вэнтыляцыя на гарбарні „Бальшавік" папраўлена

У свой час надрукавана была заметка ў газэце «Зьвязда» аб фактах ненармальнага функцыянаваньня вэнтыляцыйнай сыстэмы на гарбарні «Бальшавік», якая абышлася каля 40.000 руб., і што адміністрацыя за гэтым ня сочыць. Адміністрацыя заводу паведамляе, што факты, паданыя ў газэце, мелі месца, дзякуючы перагрузкі трансфарматарнай будкі чырвонадубнага і хромадубнага цэхаў, і пакуль не ўдалася пераключыць частку нагрузкі хромавага цэху ў 125 кілёўатамэтр у будку № 24, ня было магчымасьці пусьціць вэнтыляцыйную ўстаноўку ў ход. **Зараз усё гэта зроблена.** Таксама **зьнішчаны ўсе недахопы ў паветраправодным вэнтыляцыйнай ўстаноўцы,** аб чым таксама пісалася ў артыкуле.

„ЗЬВЯЗДА" ДАПАМАГЛА

Лішэнцы-пайшчыкі выключаны з складу Менселькрэдыту

Мен. АКК-РСІ паведамляе па допісе, надрукаваным у газ. «Зьвязда» «Няправільны ўхіл у работе Менселькрэдыту», што сапраўды пайшчыкамі ў Менселькрэдыце зьяўляліся лішэнцы і быў заключаны дагавор на агуркі з прыватнікамі **старшынёй Капусьціным.** Пастановай РСІ **ўсе пайшчыкі-лішэнцы выключаны з складу Менселькрэдыту, Капусьціну абвешчана вымова.**

Паведамленьні

— ДОМ АСЬВЕТЫ.—У суботу 3-VIII г. г. роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход жанчын—сяброў саюзу Працасьветы, а таксама ўтрыманак сяброў саюзу.

Абвестка дня: 1. Аб чыстцы партыі,
2. Аб III пазыцы індустрыялізацыі.

— У нядзелю 4-VIII--г. г. адбудзецца экскурсія асьветнікаў гор. Менску ў вайсковыя лягэры «Бандарашчына».

Збор роўна а 8-й гадзіне раніцы на пасажырскай станцыі.

У выпадку кепскай пагоды — экскурсія адкладаецца.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Субота 3-VIII а 7 гадз. адбудзецца адчынены сход яч. ЛКСМБ Працасьветы. **Бюро яч.**

— У суботу, 3 жніўня г. г. роўна, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні РК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў яч. і старшынь (партыйцаў) фабзаўмясцкомаў Фрунзаўскага раёну.

Парадак дня:

1. Аб правядзеньні дня індустрыялізацыі.
2. Вынікі распаўсюджаньня 3-яе пазыкі індустрыялізацыі.
3. Бягучыя справы.

Яўка для ўсіх абавязковабез спазьненьня.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

БІБЛІЯГРАФІЯ

Па поваду „ліста вылучэнца"

(Апавяданьне Ул. Барашка, «Маладняк» № 7 за 1929 г.).

У нас шмат пісалі аб тым, што пралетарская літаратура толькі тады будзе ў сапраўднасьці адбіваць быт працоўных і будаўніцтва сацыялізму ў розных галінах і пакажа новых людзей, калі пісьменьнікі будуць ведаць добра людзей, умовы жыцьця і работы на заводах, фабрыках і ў вёсцы, будуць вывучаць працесы вытворчасьці, будуць цесна зьвязаны з жыцьцём.

«Ліст вылучэнца» кажа аб тым, што аўтар яго ня мае сталага азнаямленьня з тым, аб чым піша. Зразумела, што мастацкі твор не павінен быць сухім пратаколам ці актам аб канкрэтным факце, але-ж таксама, зразумела, што ён (твор) павінен даваць тыповыя малюнкі і вобразы, павінен быць характэрным.

Вострай праблемай зьяўляецца пытаньне аб рабоце нашых вылучэнцаў, аб адносінах да іх кіраўнікоў, спэцыялістых, апарату. Каб мастацкі апісаць гэтае, трэба даваць ня дадзеныя з газэтнай хронікі па трафарэце, а паказаць вылучэнцаў у тэй абстаноўцы, у якой яны бываюць і дзе яны працуюць—паказаць усю прынцыповую важнасьць пралетарызацыі апарату. Для гэтага зусім непатрэбна апісваць вылучэнца ў установе, дзе яго ніколі ня было, значыць выключна карыстацца толькі фантазіяй і ня мець ніводнага факту.

Аўтар закранае такое пытаньне, як задавальненьне Менску маслам. Але-ж паколькі крыніцы інфармацыі аўтара аб становішчы малочна-жывёлагадоўчай капэрацыі на наш погляд, вельмі невыстарчальныя і ня зусім добраякасныя, ня варта спыняцца зараз на гэтым пытаньні.

Лепш застановімся на тэй частцы апавяданьня, дзе апісваецца жанчына—вылучэнка. Мне здаецца, што гэта самае **ганебнае месца** ў творы. Падамо вытрымкі.

«А побач з нашым габінэтам-аргаддзел. Загадчык там-такая, як і я—вылучэнка. Сялянка, з арцелі на працу ў саюз узялі. Гаваркая кабеціна, разводка. **Мужчын любіць, дык ліха яе ведае.** Часта па справах прыходзіць яна ў мой і «белабрысага» габінэт. Пра справы гаворыць? Не. Зусім не.—**Я, кажа,—прапагандзірую свабодную любоў. З кім хачу з тым і жыву....**

А камуністка....

«А, памойму, аргаддзеліха «сьцерва» харошая».

Мастацкі твор, як вядома, малюе не выпадковае, а тыповае. Значыць, паводле Барашкі ўсе нашы вылучэнкі-камуністкі толькі і здольны, што **«прапагандзіраваць свабодную любоў».**

Ці не ёсьць гэта адрыжка буржуазнай хлусьні на нашых жанчын, ці можна ў масавым мастацкім творы так трактаваць нашых жанчын-вылучэнак наогул і камуністак у прыватнасьці. Вось так і падыходзіць на вёсцы пры перавыбарах сялянак кулакі і падкулачнікі «Навошта нам кабеты. Яны толькі распусту разводзяць». У той час, як наша партыя ўсё больш і больш завастрае ўвагу на вылучэньні жанчын, калі патрабуе для іх таварыскай чуласьці і дапамогі ў рабоце, стварэньні спрыяючых умоў, мастацкі-ж твор малюе вылучэнак, як распусьніц. Неча сказаць добрая папулярызацыя ідэі вылучэньня працоўных жанчын.

Яшчэ зьвяртае на сябе ўвагу наступнае. Чаму гэты рабочы вылучэнец, кваліфікаваны рабочы-чыгуначнік, удзельнік грамадзянскай вайны, член партыі, член АКК, як быццам лепшы прадстаўнік рабочай клясы, павінен так ганебна выражацца аб таварышох-камуністках? Чаму ён не знаходзіць іншага выразу, як «сьцерва»? Няўжо за 12 год «лексікон» нашых рабочых не зьмяніўся? Няўжо дагэтуль панае сярод нашых таварышоў рабочых і камуністых погляд на жанчыну, як на нероўнага таварыша? Здаецца, што і тут т. **Барашка** мякка кажучы памыляецца, і мусіць свой погляд і свае адносіны да жанчын-вылучэнак і да камуністак выдае за погляды і адносіны нашых перадавых рабочых.

І што гэта за выраз **«аргаддзеліха»?** І тут адчуваецца пагарда, грэблівасьць да жанчыны, якая выконвае словы Леніна: «Кожная кухарка павінна умець кіраваць дзяржавай». Пераважная большасьць беларускіх акруговай КП(б)Б высунула ў якасьці загадчыкаў аргаддзелаў акруговых саюзаў малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі жанчын. Тры працуюць больш году і апраўдалі сябе на працы. Дзьве вылучаны толькі некалькі дзён таму назад. З трох працаваўшых ніводная ні на ёту не падыходзіць пад «мастацкую» характарыстыку апавяданьня. Але якая справа да ўсяго гэтага Барашку? Аднак ганьбіць камуністак, вылучаных партыяй на адказную працу, нельга дазволіць. Наша пралетарская літаратура павінна дапамагчы гэтай вялікай справе, а не кампрамэтаваць яе мэтодамі бульварнай пісаніны.

ЛІБМАН.

Судовая хроніка

За ўтойваньне памольнага збору

Прыватны млынар вёскі Каралёўстан, Калодзішчынскага сельсавету, Карыцкі Кастусь парушыў закон аб памольным зборы, заведма ня здаўшы належнага з яго збору ў каапэрацыю.

За верасень і кастрычнік м-цы мінулага году паступіла памольнага збору 3260 кл., а здаў ён толькі 2100 кл.

Нарсуд 1 вуч. прыгаварыў Карыцкага да 150 руб. штрафу.

Прыгавар над растратчыкам

Паказальны суд над гідратэхнікам Мацьвеевым, які растраціў 3 тысячы рублёў, адбыўся 1 жніўня. Растратчык прыгавораны да 4 гадоў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пакараньнем у правох пасьля адбыцьця пакараньня на два гады.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і камэдыя пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА. Субота, 3 жніўня „РОЗ-МАРИ" музкамэд. у 3-х д. і 9 абраз. Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе 4—6 гадз. увеч. з 12—2 і ад Пачатак а 9 г.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Буйны мастацкі баявік СПРАВА 128 у 8-ці частках. Звыш праграмы-кіно-хроніка „Совкино" № 34 Пачатак роўна а 8 гадз. Каса—ад 6 гадз.

Кіно-сад Чырвоная Зорка Савецкая, 71. — НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ДЖАЛЬМА Кіно—драма ў 7 частках 2 сэансы: пачатак 1-га с.—а 9 г. 15 м. 2-га с.—а 10 г. 45 м.

КІНО Інтэрнацыянал — Грандыёзны мастацкі замежны баявік ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА паэма ў 7 частках Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз. увеч.

КІНО Пралетары — НОВЫ НЯМЕЦКІ БАЯВІК Дона-Жуана Пачатак сэансу а 7 з пал, гадз. увеч. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Спартак — БАЯВІК НАТЭЛЛА драма ў 7 част. у гал. ролі —НАТА ВАЧНАДЗЕ Касса—ад 6 гадз.—Пачатак а 7 з пал. г. ув.

АДКРЫТА ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6. Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болі, лячэньне хвароб поласьці роту. УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на каўчуку і золаце. Цэны агульнадаступныя. Парада дармова. У лячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам. Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА. Прыём з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзенна

Работнікі мастацтва—у фонд ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ
ПАМЯТАЙЦЕ! ПАМЯТАЙЦЕ!
У ПАНЯДЗЕЛАК, 5 ЖНІЎНЯ
АДКРЫТЫ УСЕ КІНО-ТЭАТРЫ г. МЕНСКУ.
ТАКСАМА ПРАЦУЕ
МУЗЫЧНАЯ КАМЭДЫЯ пад кіраўніцтвам Л. Г. МІРАЕВА ў дзяржтэатры.
ВА УСІХ КІНО-ТЭАТРАХ толькі ў гэты дзень будуць дэманстравацца ЛЕПШЫЯ КАРЦІНЫ СЭЗОНУ. Пасьля кожнага сэансу выступаюць артыстыя эстрады.
У ДЗЯРЖТЭАТРЫ 1-шы раз у гэтым сэзоне —папулярная музычная камэдыя „КОРОЛЬ ВЕСЕЛИТСЯ". У гэтай п'есе прымае ўдзел увесь склад музычнай камэдыі.
АЎТОРАК, 6-га ЖНІЎНЯ
ў садзе „ПРАФІНТЭРН" (б. Гарадзкі сад)
НЯБЫВАЛАЕ яшчэ да гэтага часу ў МЕНСКУ ГУЛЯНЬНЕ.
Грандыёзнае відовішча--«КАРНАВАЛ АГНЁЎ». Зьлёт усіх лепшых артыстых.
Падрабязнасьці чытайце ў зводнай і спэцыяльных афішах.
КАМІСІЯ.

ПАСЬПЯШЭЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.--90к., на 3м.--2 р. 60к., на 6 м.--5 р., на 1 г.--9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крэсьтьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, яе упоўнаважанымі, адд. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адд. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ра Друку і усімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

РОЗЫГРЫШ ЛЁТАРЭІ, абвешчанай часопісьсю «Беларуская Работніца і Сялянка», адбудзецца 4-га ЖНІЎНЯ ў 5 гадзін вечара ў памяшканьні Дому Сеяніна.
Камісія запрашае падпісчыкаў прысутнічаць пры розыгрышы.
РЭДАКЦЫЯ.

Беларускаму сельска-гаспадарчаму трэсту БЕЛСЕЛЬТРЭСТ патрабуюцца вопытныя майстры-крахмальшчыкі і мэханікі, якія ведаюць КРАХМАЛЬНУЮ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ, для сталай працы на крахмальных заводах. З прапановамі зварочвацца: Менск, Савецкая, 70, БЕЛСЕЛЬТРЭСТ

Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву ПАТРЭБНЫ для зьдзельнай работы СТЫЛІСТЫЧНЫЯ РЭДАКТАРЫ якія ДАСКАНАЛА-б ведалі БЕЛАРУСКУЮ мову. АПЛАТА ПА АРКУШАХ.
За спраўкамі і работай зьвяртацца ў стыльрэдакцыю Выдавецтва па панядзелках, серадах і пятніцах ад 2 да 3½ гадз.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

ЮЖСОЮЗТРЕСТ ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ ХИМСИНДИКАТ

СКОРА ДА ЗАЎТРА САЧЭЦЕ

ЗЬВЯЗДА ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ ШТРЫХОВЫЯ ТОНАВЫЯ МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ = = ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3Ш ПАВЕРХ
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛАНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Два бірж. талёны Вендорф М. Р., выд. Менскай біржай працы 2154
Кніжка беспрац. Нечаева С. Е., выд. Менстрахкасай 2155
Пашпарт Лобер Ш. М., выд. Кіеўскай міліцыяй 2156
Чл. кніжка саюзу будаўнікоў Матуса Г. Г. 2157
Хлебная наборная кніжка Васільевай М., выд. ТПО МБФ чыг. 2158
Пашпарт Гольдберг Х. А., выд. Менск. міліцыяй 2159
Чл. білет саюзу харчавікоў Сафонава Г. Ф. за №1574 2160
Чл. білет саюзу мэдсанпрацы Шчаглова І. І. 2161
Каапэрац. кніжка Навіцкага І. М., выд. Менск. прыгарадным спажывецк. т-вам «Земляроб» 2162
Даведка аб працы Лантаса А. А., выд. пададзелам грамадзкіх рабочых Менкамгасу 2163
Асабовая кніжка, членскі білет саюзу рабземлес № 2682 2164—2165

Друкарня газэты «Зьвязда». Менск